

УСЁ ЖЫЦЦЁ МЫ МУСІМ БЕГАЦЬ 7

БЛІСКУЧАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ КІТАЯ 9





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. СУБОТА № 208 (29830)


## КОРАТКА

- Мемарыял у памяць аб ахвярах яўрэйскіх гета ў Беларусі адкрылі на алеі «Яр а-Кдушым» пад Іерусалімам.
- Камеры фота- і відэафіксацыі пачалі кантраляваць наяўнасць дзяржтэхагляду.
- Новы рэзідэнт «Вялікага каменя» зоймецца вытворчасцю пажарных дронаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Сёння істотна ўзрос попыт на мірны атам: нават краіны, якія раней выступалі супраць развіцця атамнай энергетыкі, цяпер пераглядаюць свае энергетычныя стратэгіі і ўключаюць у іх праекты па будаўніцтве атамных электрастанцый. Праект па ўзвядзенні БелАЭС рэалізуецца перш за ўсё для задавальнення ўнутраных патрэбнасцяў у электраэнергіі. Калі прымалася рашэнне аб будаўніцтве станцыі, стаяла задача вырашыць тры блокі пытанняў. Нашых магутнасцяў з улікам уводу атамнай станцыі дастаткова. Другая задача — знізіць долю прыроднага газу ў энергабалансе краіны. Увод станцыі дазволіць штогод замяшчаць каля 4,5 млрд м³ газу. Трэцяя задача заключаецца ў задавальненні ўзрастаючых патрэбнасцяў у электраэнергіі рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва. Прынятыя на ўзроўні кіраўніка дзяржавы і ўрада стымулюючыя меры, накіраваныя на рост электраспажывання, даюць аддачу, сёння мы гэта бачым».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ТРЭБА ЖЫЦЬ СВАІМ РОЗУМАМ. ТРЭБА РАБІЦЬ ТОЕ, ШТО НАМ ВЫГАДНА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з рабочым візітам наведаў Брэсцкую вобласць. Тут на агульнавайсковым палігоне Абуз-Лясноўскі пад Баранавічамі ён азнаёміўся з распрацоўкамі айчыннага ваенна-прамысловага комплексу. Увазе Галоўнакамандуючага прадставілі беспілотныя авіяцыйныя комплексы і іншыя ўзоры ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, распрацаваныя арганізацыямі абароннага сектара эканомікі.**



Галоўнакамандуючы і механік-вадзіцель танка Т-72БМ-2 Канстанцін ГАЙВАРАНЮК.

### «Усё павінна быць па-сапраўднаму»

«Ты ж не проста паказваеш у адзіным экзэмпляры ўзор. Любы ўзор зараз на фронт — і ён ваюе? — удакладніў Аляксандр Лукашэнка ў старшыні Дзяржкамваенпрама Дзмітрыя Пантуса падчас агляду беспілотнікаў. Прэзідэнт пацікавіўся, хто купляе гэтыя машыны ў беларускіх вытворцаў. «Хто купляе — таму і будзем прадаваць. Непажадана, вядома, каб нашы ўзоры ваявалі ва Украіне: усё ж свае людзі», — падкрэсліў ён.



Беспілотны авіяцыйны комплекс «Бусел МКГ».

Акрамя беспілотных лятальных апаратаў, на палігоне Прэзідэнту прадэманстравалі і іншыя ўзоры ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, сярод якіх оптыка-электронныя комплексы для абароны граніц і аб'ектаў інфраструктуры, лазерная і электрамагнітная зброя, рабатызаваны агнявы комплекс, баявыя і разведвальныя машыны, мадэрнізаваныя бронетранспарцёр і танк Т-72БМ2, аснашчаны абаронай ад супрацьтанкавых ракетных комплексаў. Наконт характарыстык і адметных асаблівасцяў тэхнікі Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся непасрэдна ў экіпажа.

«З пункту гледжання сучаснай вайны патрэбны больш сучасныя танкі?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Міністр абароны Віктар Хрэнін адказаў, што беларускія танкі мадэрнізуюцца і не горшыя за Т-90.

«Гэта значыць, трэба свае танкі прывесці ў парадак — і нармальна. Калі ён гаворыць, што гэта добры танк, будзем на яго арыентавацца. Давайце будзем да розуму гэтыя танкі даводзіць», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці актуальна сёння ўвогуле выкарыстанне танкаў у сучасных баявых дзеяннях. «Квадракоптары і барацьба з імі, станцыі РЭБ сёння на мяне больш робяць уражанні, чым танкі», — прызнаўся ён.

Але Віктар Хрэнін адзначыў, што толькі танкам можна забяспечыць актыўнасць абароны.

СТАР. 2

Модная зіма

# Калі надыдуць халады...

### Пагаварылі са стылістам пра тое, што і дзе прыкупіць да зімы, каб выглядаць актуальна

**Быццам бы на вуліцы досыць цёпла, а зіма пакуль «за гарамі», але гуру моднай індустрыі заўсёды на крок наперадзе падзей. Трэнды хуткай зімы яны прадставілі грамадскасці яшчэ летам, зараз калекцыі ўжо адшытыя, трэнды растыражаваныя — ад буцікаў да масмаркету — і прыйшла пара прымяраць іх на сябе. Дык давайце высветлім, якія модныя тэндэнцыі прынясе з сабой гэтая зіма і наколькі яны сёння даступныя беларускаму спажыўцу.**

### ПАЧНЁМ З ГАЛОЎНАГА...

Галоўны набытак да халоднага сезона, зразумела, — верхняя вопратка, адначасова і стыльная, і цёплая. Зіма — гэта, вядома ж, ***футравыя рэчы***: тут новы халодны сезон цалкам кансерватыўны. Але жывёлы зноў у бяспецы — экафутра не здае сваіх пазіцый, а натуральнае — паранейшаму не на піку актуальнасці. Галоўнае правіла — сучаснае экафутра не павінна быць «родам» з вашага дзяцінства або імітаваць котку пасля дажджу. Яно наогул не створана, каб імітаваць нейкага звера — не павінна стварацца ўражання, што вам проста не хапіла



Актуальныя мадэлі пухавікоў — як доўгія, так і кароткія, а таксама зусім скарочаныя.

грошай на «шанхайскага барса», і вы замянілі яго бюджэтным аналагам. Штучнае футра — гэта самадастатковы модны матэрыял, так ён і павінен выглядаць. На подыумах былі прадстаўлены і яркія, акцэнтныя мадэлі з каляровага футра, і футрачкі і паліто ў стрыманай, натуральнай гаме — але ўсё роўна штучнае павінна заставацца такім, а не «падробкай пад натуральнае». Гэта важна ўлічваць, выбіраючы абноўку.

СТАР. 8

ISSN 1990 — 763X

# «ТРЭБА ЖЫЦЬ СВАІМ РОЗУМАМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Гэта значыць, танкам быць? Таму трэба мадэрнізаваць. Трэба выходзіць на больш істотныя аб'ёмы мадэрнізацыі», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Увазе Галоўнакамандуючага прадставілі і медыцынскія камплекты, якімі ўкамплектаваны беларускія ваенныя. На розныя ваенныя сітуацыі — розныя камплекты са сродкамі айчыннай вытворчасці.

«Індывідуальная аптэчка павінна быць не горшая за натаўскую. ***Не спрашчайцеся, рабіце, як лепш. Не дай Бог, што здарыцца, з-за гэтага загіне чалавек. Таму спрашчацца нельга. Усё павінна быць па-сапраўднаму. Не горш, чым у ворага. Павінна быць лепш»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Беларуская армія нацэлена на абарону сваёй тэрыторыі

Пасля агляду тэхнікі Прэзідэнт сустрэўся з журналістамі і адказаў на актуальныя пытанні. Але найперш падзяліўся ўражаннямі ад убачанага на палігоне. Прэзідэнт падкрэсліў, што беларуская армія перш за ўсё нацэлена на абарону сваёй тэрыторыі, а не нападзенне, таму і распрацоўваюцца адпаведныя ўзоры ўзбраення. «Тут мы, вядома, лідары ў свеце, і гэта не менш важна, чым мець такія беспілотнікі, якія могуць наносіць удары па пэўных мэтах», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што чацвёрты ці пяты раз праводзіцца мадэрнізацыя нашай арміі і ўзбраення найперш. Адпаведныя планы абмяркоўваліся даўно і, па словах Прэзідэнта, былі завоблачныя. Але, калі пачалася спецыяльная ваенная аперацыя, стала зразумела, што трэба выносіць урокі і рабіць адпаведныя высновы.

Ён нагадаў, што вядома шмат выпадкаў, калі са строю выходзіць самы сучасны танк і не ведаюць, што з ім рабіць. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што танк Т-72 мадэрнізаваны да такога ўзроўню, што ён не ўступае самым сучасным стандартам. «Гэта наш шлях, мы пачалі мадэрнізацыю гэтых танкаў і будзем паскарацца. Можна захапіцца апавяданнямі са сродкаў масавай інфармацыі і зайсці вельмі далёка, патраціць вялізныя грошы, а не дасягнуць таго выніку, якога мы хацелі б. ***Таму, робячы высновы і ўрокі, мы, напэўна, у разоў пяць, а можа быць, і больш, зможам скараціць фінансаванне, але дасягнуць таго выніку, які патрэбен.*** Галоўнае — вучыць, вучыць людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Не толькі сябе — краіну трэба абараняць

Журналісты пацікавіліся меркаваннем Прэзідэнта наконт укідаў у інтэрнэце аб нібыта тайнай мабілізацыі ў Беларусі. Прэзідэнт растлумачыў, што такое мабілізацыя, каб «апусціць на зямлю». Ён прывёў просты прыклад. Чалавек атрымаў павестку ці іншым шляхам апавешчаны. Прыходзіць у ваенкамат. Там глядзяць, які спецыяліст, і ён накіроўваецца ў ваенную часць. «Хай прывядуць хоць адзін прыклад, калі мы запрасілі чалавека ў ваенкамат, далі яму, груба кажучы, ружжо і адправілі ў часць. Няхай прывядуць хоць адзін прыклад», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што беларусы вучацца на ўроках расійскай мабілізацыі. Напрыклад, там былі выпадкі, калі прыйшла павестка, а чалавека няма — з'ехаў, памёр. Таму беларускім ваенным пастаўлена задача: праз ваенкаматы адпрацаваць сістэмы апавяшчэння. ***«Гэта значыць, адпрацаваць шляхі, як дагрукацца да чалавека, якога мы хочам мабілізаваць. Далей — знайшлі яго, запрасілі ў ваенкамат, удакладнілі, паглядзелі, падыходзіць ці не — ідзі хлопец, адпачывай. Вось якая ў нас мабілізацыя. Паклікалі, паглядзелі — ідзі працуй.*** Якая тут мабілізацыя?» — расказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што для Беларусі вельмі важная тэрытарыяльная абарона. «Кожны павінен абараняць свой дом, гэта на месцы людзі. Мы таксама гэта правяраем. Я заўтра дам каманду падняць тэрытарыяльную абарону — паднялі ўсіх, яны выйшлі на абарону аб'ектаў, масты, электрастанцыі, тое, што трэба для забеспячэння жыцця ўласнага дому», — сказаў ён. І яшчэ адзін від войскаў, якія пачынаюць разгортваць, — народнае апалчэнне. Прэзідэнт звярнуў увагу, што сёння кожны павінен умець ваяваць, кожны павінен умець страляць. Ён растлумачыў, што гэта вопыт, які за плячыма не насіць. «У мяне і ў сям'і такі падыход, нягледзячы на тое, што я Прэзідэнт. Мае дзеці ўсе ваенныя і нават малодшы — яны рыхтуюцца сябе абараняць. І не толькі сябе — краіну трэба абараняць», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў, што на сёння ў Беларусі няма ніякай вайны і нашай краіне яна не патрэбная. «А калі палезуць... Ну вось мы трэніруемся, можна нас за гэта крытыкаваць, і мяне ў тым ліку. Усё трэба рабіць. ***Трэба разлічваць на свае сілы. Я ж не адмаўляю — я рыхтуюся да вайны. 25 гадоў мінімум я рыхтуюся да вайны. Не я прыдумаў: хочаш міру — рыхтуйся да вайны. Я і рыхтуюся, як галоўнакамандуючы. Таму трэба супакоіцца. Кожны павінен займацца сваёй справай. Я як Прэзідэнт буду рабіць сваю, у мяне спектр інтарэсаў і адказнасці значна шырэйшы, чым у звычайнага чалавека. Трэба займацца сваёй справай, калі мы хочам, каб не было балюча»***, — адзначыў ён.

## «Усё будзе ісці ад народа»

У чацвер Прэзідэнт правёў нараду, адной з тэм якой быў законапраект «Аб Усебеларускім народным сходзе». Журналісты не пакінулі без увагі гэтую тэму. І пацікавіліся, ці не прывядзе надзяленне УНС шырокімі паўнамоцтвамі да дэцэнтралізацыі ўлады. Справа ў тым, што ў інтэрнэце распаўсюдзілася інфармацыя, маўляў, «Лукашэнка будзе прызначаць членаў УНС».

Па словах Прэзідэнта, Усебеларускі народны сход — гэта найвышэйшы орган прадстаўнічай улады. І ўсё будзе ажыццяўляцца выключна выбарным шляхам, за выключэннем людзей, якія будуць там займаць месцы па пасадзе: дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, прэм'ер-міністр, дзеючы Прэзідэнт. Яны там будуць займаць свае месцы, яны прадстаўляюць большую частку народа. ***«УНС — гэта выбарчы орган, усё будзе ісці ад народа. І Лукашэнку няма такой неабходнасці там прызначаць. А тыя «буракападобныя таварышы» — яны туды не трапяць. Іх туды ніхто не выбера. Яны ворагі народа. Ворагам народа там рабіць няма чаго. Людзі са сваім пунктам гледжання — калі ласка, па пэўных правілах, якія для ўсіх будуць устаноўлены. Калі ім будзе аказаны давер — яны туды трапяць»***, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ніякай дэцэнтралізацыі ўлады няма і быць не можа. УНС — гэта ўжо адпрацаваная гадамі форма, ёсць практыка яго правядзення. «УНС толькі стратэгіяй будзе займацца і кантролем за выкананнем стратэгічнай задачы. Як быў Прэзідэнт кіраўніком дзяржавы, так ён і застанецца. Мы дэмакратызуемся ў тым плане, што Вярхоўны і Канстытуцыйны суды, Цэнтральная выбарчая камісія з-пад Прэзідэнта выведзеныя ва Усебеларускі народны сход, каб не было прэтэнзій, што ЦВК палічыў не так ці суддзі ад кагосьці з выканаўчай улады залежныя», — растлумачыў ён.

У працяг гаворкі аб дэмакратыі Прэзідэнт канстатаваў, што Беларусі такая дэмакратыя, як у Еўропе, не патрэбна. «У Вялікабрытаніі пасмешышча, ну які народ абраў Ліз Трас. Ну які народ абіраў? Сабраліся — абралі. Ядзерная дзяржава, на ўсялякі выпадак. Вельмі багатая. І грае адну з ключавых роляў у свеце. Пасмешышча», — адзначыў ён. Таму кіраўнік дзяржавы накіроўвае: ***«Сваё, сваё, толькі для сябе. Не глядзіце, што будуць нам падкідваць дэмакратыю, рыначную эканоміку ды іншае...»***

Аляксандр Лукашэнка іранічна заўважаў, што, калі б у Мінску дэмакратызавалі дубінкамі, гэта катастрофа, аўтарытарызм. А ў Францыі можна. Вось і ўся дэмакратыя. ***«Трэба жыць сваім розумам. Трэба рабіць тое, што нам выгадна. Да чаго гатовы наш народ і ўлада ў тым ліку. Можаце рэгуляваць цэны — рэгулюйце. Можаце кіраваць прадпрыемствамі — кіруйце.*** Не можаце — лепш паглядзець на прыватызацыю. ***Трэба зыходзіць з рэальнай рэчаіснасці.*** Калі нам патрэбныя гэтыя квадракоптары і станцыі іх знішчэння — давайце іх рабіць», — сказаў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што ў Беларусі ніхто не займаецца паказухай. Так, на палігоне быў паказ, але тут не было ні грама паказухі. «Пацэлілі — пацэлілі. Прамазалі — прамазалі. Мы людзі ваенныя, мы гэта бачым. Адпрацавалі нядрэнна», — канстатаваў Галоўнакамандуючы.

## «Каму сёння хочацца памерці?»

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што ён не верыць, што можа пачацца трэцяя сусветная вайна. Але папярэджвае, што баяцца і прадбачыць трэба ўсё: «Хто сёння можа сказаць, што не пачнецца трэцяя сусветная вайна? Мы як ніколі блізкія да яе. Але я не веру, што трэцяя сусветная вайна будзе. Таму што небяспека ў тым, што трэцяя сусветная вайна прывядзе да знішчэння ўсіх і ўся. Ну каму хочацца сёння памерці?»

Журналісты пацікавіліся ў Прэзідэнта, ці не трэба на фоне правядзення контртэрарыстычных мерапрыемстваў абмяжоўваць перамяшчэнне на беларускай граніцы? У сувязі з тым, што ў краіне дзейнічае бязвіз для суседзяў, штодня ў Беларусі прымаюць перасяленцаў з Украіны, няма гарантыі, што сярод гэтых людзей няма тэрарыста.

«Адказваю прама: гарантыі ніхто даць не можа. Але свет вельмі адкрыты, узаемазалежны. Тэрарысты, калі яны і пачнуць атакаваць нас, не будуць хадзіць прама: у іх даўно вызначаны шляхі. Так, яны ў натоўпе могуць згубіцца, але гэта вельмі рызыкоўна і небяспечна, у іх дастаткова іншых шляхоў. Спецслужбы гэта ведаюць. Пакуль мы спраўляемся. Будзем старацца справіцца», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што нядаўна праваахоўнікі абясшкодзілі банду тэрарыстаў. Яны сабраліся здзяйсняць на тэрыторыі нашай краіны злачынствы. І гэта яшчэ не ўсё. «Што яшчэ трэба для доказу таго, што нам спакойна жыць не дадуць? Так, можна закрыць уезд, можна забараніць. Але вы не думайце, што мы не працуем на пунктах пропуску і перасячэння. Сучасныя сродкі кантролю даюць нам такую магчымасць працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Да таго ж, па яго словах, унутры краіны хапае ідыётаў і мярзотнікаў, якія «за пяцьсот долараў гатовы сёння ўчыняць нейкія там дзеі і злачынствы». ***«Свет такі, што чорт яго ведае, адкуль чакаць гадасці і брыдоты.*** Думаю, што нам трэба проста працаваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «Я тут. Чаго мяне шукаць?»

Прадстаўнікі СМІ папрасілі Прэзідэнта пракаментаваць інфармацыю аб тым, што нібыта Служба бяспекі Украіны аб'явіла яго ў вышук. «А чаго мяне аб'яўляць? Я тут. Калі трэба СБУ, няхай прыедуць сюды. Калі захочуць мяне ўбачыць — калі ласка», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Інфармацыя аб гэтым актыўна абмяркоўвалася ў інтэрнэце. Але пазней СБУ абвергла гэта.

«А хто афіцыйна пацвердзіць? Трэба спачатку ўкінуць, паглядзець рэакцыю. Рэакцыя мая першапачатковая такая: прыязджайце, не пытанне. Пры вас сустрэнуся з імі, пагавару. Бяспеку на сваім участку тэрыторыі забяспечым на сто працэнтаў. Мы адкрытыя людзі, нам баяцца няма чаго», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён адкрыў журналістам інсайд: СБУ два дні таму папрасіла аб сустрэчы беларускіх спецыялістаў. Пазіцыя беларусаў як заўсёды адназначная: калі ёсць пытанні — давайце сустракацца. Прэзідэнт падкрэсліў, што самыя галоўныя тэмы абмяркоўваюцца заўсёды па-за публічнай плоскасцю.

На гэтым тыдні Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з расійскім філосафам і грамадскім дзеячам Аляксандрам Дугіным. Падчас размовы закранылася тэма нацыянальнай ідэі. Журналісты згадалі гэтую сустрэчу і вярнуліся да тэмы. ***«Нацыянальная ідэя — тое кароткае, кампактнае, што цябе павінна захапіць адразу. Вось зірнуў, рот адкрыў і дыхаць не можаш.*** Можа, я памыляюся. Гэта мой пункт гледжання. Але я пакуль такой ідэі не бачу», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, гэтую ідэалогію нельга прыдумаць. Яна павінна выспець.

***«Мы не саспелі, напэўна. Мы яе не выкрышталізавалі, калі можна так сказаць, гэтую нацыянальную ідэю. Я за гэтым вельмі ўважліва назіраю. Я пакуль не бачу.*** Расія тым больш, як сказаў Дугін, таксама гэтага не бачыць . Ён чалавек сістэмны, адукаваны філосаф, мы з ім доўга гаварылі. Ён са мной пагадзіўся. ***Хацелася б, каб хутчэй, але тут час не падштурхнеш»***, — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*Брэсцкая вобласць.*

---

# «Нам важна даць школьніку каштоўныя веды, але важней — выхаваць яго чалавекам і патрыётам сваёй краіны»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала Полацкі раён. На пасяджэнні Полацкага райвыканкама былі абмеркаваны пытанні рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка на 2021—2025 гады», а ў будаўніча-мантажным трэсце № 16 прайшла дыялогавая пляцоўка.**

Якасць інклюзіўнага навучання, кадравыя пытанні, умовы для замацавання маладых спецыялістаў на Полаччыне — гэтыя і шэраг іншых пытанняў сталі галоўнай тэмай сустрэчы з актывам раёна.

«Наша задача — прыцягнуць, зацікавіць моладзь магчымасцю застацца ў сваім рэгіёне. Правядзіце аналіз, колькі вучняў школ вяртаюцца сюды пасля заканчэння ВНУ і ССНУ, даведайцеся тэндэнцыю. І падбярыце актуальныя варыянты работы з маладымі кадрамі. Пры гэтым памятайце, што выхаваць сапраўдных патрыётаў роднага краю можна толькі на сваім прыкладзе», — адзначыла Наталля Качанава.

У гэтым годзе ў Полацкі раён прыйшлі 309 маладых спецыялістаў, замацаванне на працоўных месцах пасля двух гадоў абавязковага размеркавання на высокім узроўні — 72 працэнты. Адным са складнікаў гэтага выніку з'яўляецца падтрымка моладзі ў жыллёвых пытаннях: у мінулым годзе педагогам было выдзелена 11 арэндных кватэр, медыкам — 12.

На сустрэчы з актывам раёна Наталля Качанава заастрыла ўвагу прысутных на пытанні не фармальнага, а намінальнага інклюзіўнага навучання ва ўстановах адукацыі рэгіёна, асабліва для дзяцей з аўтызмам і сіндромам дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасцю. Начальнік упраўлення па адукацыі райвыканкама Ірына Драздова адзначыла, што з гэтага навучальнага года ў 9-й і 14-й школах горада ўведзены стаўкі цьютараў, але праблемы, якія трэба вырашыць у гэтым напрамку, ёсць.

«Звыш 2000 дзяцей у раёне ахоплены інклюзіўным навучаннем, добра, але іх намнога больш. У нашым сучасным грамадстве мы дагэтуль сутыкаемся з праблемай непрыняцця людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а яшчэ — недахопам педагагаў-спецыялістаў. Пытанне арганізацыі навучальнага працэсу будзе ўзята на кантроль, бо ў першую чаргу гэта задача педагагаў і медыкаў», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

*Аб чым яшчэ ішла размова ў Полацку — чытайце ў наступным выпуску «Мясцовага самакіравання».*

Парламенцкі дзённік

# АМНІСТЫЯ ЗАКРАНЕ 8,5 ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК

## Дэпутаты абмеркавалі адпаведны законапраект

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў абмеркавалі праект закона «Аб амністыі ў сувязі з Днём народнага адзінства». Яго прадставіў намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ. Пасля парламентарыі і запрошаныя, у прыватнасці прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, выказалі свае меркаванні.**

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** нагадаў, што кіраўнік дзяржавы даручыў дэталёва абмеркаваць законапраект з усімі зацікаўленымі.

— 10 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі ўнёс у Палату прадстаўнікоў праект закона «Аб амністыі ў сувязі з Днём народнага адзінства». На вераснёўскай нарадзе, прысвечанай у тым ліку і гэтай тэме, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што з-за асаблівага грамадскага гучання законапраекта яго неабходна яшчэ раз дэталёва абмеркаваць з усімі зацікаўленымі да разгляду ў Авальнай зале. Пытанне сапраўды адчувальнае, бо гаворка ідзе пра канкрэтныя чалавечыя лёсы. І мы па доследзе ведаем, што кожны раз, калі ўступае ў сілу такі закон, людзі разглядаюць яго палажэнні ледзь не пад мікраскопам. Любая несправядлівасць выклікае негатыўны рэзананс, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён нагадаў, што апошняя амністыя ў Беларусі была праведзена ў 2020 годзе. За гэты час сацыяльна-палітычная сітуацыя ў краіне, ды і грамадскія настроі сур'ёзна змяніліся. І заклікаў старанна ўзважыць прапанаваныя законапраектам нормы з улікам усіх абставін і прадставіць грамадскасці абгрунтаваныя довады, якімі кіруецца дзяржава.

— Зразумела, тыя, хто знаходзіцца сёння ў месцах зняволення, панеслі пакаранне заслужана. Але не ўсе яны — закаранелыя злачынцы. Хтосьці проста спатыкнуўся, учыніў правапарушэнне па няведанні, неасцярожнасці. Многія ўсведамляюць сваю віну і становяцца на шлях выпраўлення. Нягледзячы ні на што, яны застаюцца нашымі грамадзянамі. І абавязак дзяржавы — дапамагчы ім вярнуцца ў свае сем'і і зноў стаць добрапрыстойнымі членамі грамадства. У гэтым і заключаецца сэнс такога жэсту добрай волі, як амністыя, — дадаў Уладзімір Андрэйчанка. — У той жа час вельмі важна не перайсці рысу, за якой меркаванні гуманнасці і міласэрнасці ўступаюць у супярэчнасць з інтарэсамі нацыянальнай бяспекі або з тым, што думаюць на гэты конт нашы законапаслухмяныя грамадзяне.

Генадзь Казакевіч заўважыў, што ў Беларусі заўсёды прымяняецца прынцып гуманізму ў адносінах да асоб, якія адбываюць крымінальнае пакаранне, дзяржава дае магчымасць асуджаным, якія выправіліся, датэрмінова вызваліцца.

— Згодна з папярэднімі разлікамі, пры рэалізацыі праекта закона плануецца вызваліць каля 4,5 тысячы асуджаных, у тым ліку з месцаў пазбаўлення волі — 1600, з іх 10 непаўналетніх, з папраўчых установ адкрытага тыпу — 500, з крымінальна-выканаўчых інспекцый — 2,5 тысячы, а таксама скараціць тэрмін на адзін год практычна чатырох тысячам асуджаных. Усяго амністыя закране 8,5 тысячы чалавек, — адзначыў намеснік міністра.

Згодна з законапраектам, пад амністыю трапяць непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, асобы пенсіённага ўзросту, інваліды 1-2 груп, хворыя на актыўную форму туберкулёзу, асобы, хворыя на анкалагічныя захворванні, ВІЧ-інфікаваныя, ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, грамадзяне, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і іншыя грамадзяне, пры ўмове, што злачынства, якое яны ўчынілі, не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі. На непаўналетніх, якія ўчынілі злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркатычных сродкаў, амністыя таксама будзе распаўсюджвацца, і тэрмін будзе скарочаны на адзін год.

Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ**, не кожная краіна здольная на такі акт міласэрнасці, як амністыя. У прыватнасці, у краінах англа-амерыканскай і некаторых краінах рамана-нямецкай прававой сістэмы такі інстытут, як амністыя, адсутнічае ў прынцыпе.

— На мой погляд, толькі моцная, сапраўды народная дзяржава можа дазволіць сабе не толькі караць, але і праяўляць чалавекалюбства, — сказала дэпутат. — Мэта любой амністыі — абавязкова захаваць баланс інтарэсаў асобы, дзяржавы і грамадства. Таму, вызваляючы ад крымінальнай адказнасці тую ці іншую асобу, скарачаючы ёй тэрмін адбывання пакарання, мы павінны разумець, што крымінагенная абстаноўка ў краіне павінна застацца стабільнай.

**Алена КРАВЕЦ.**

Меркаванне

**Алег РАМАНАЎ:**

# «УНС — гэта найвышэйшы орган прамой дэмакратыі»

**На нарадзе па пытаннях фарміравання Усебеларускага народнага сходу і змянення выбарчага заканадаўства Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу — не пазней за сакавік 2023 года прыняць Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе». У найбліжэйшы час неабходна вызначыць парадак фарміравання і дзейнасці новага органа ўлады, які будзе прымаць важныя рашэнні, стане апорай для дзяржаўных органаў.**



Аналагаў такога законапраекта няма ва ўсёй міжнароднай практыцы: Усебеларускі народны сход — унікальны орган, які характэрны толькі для нашай краіны. У чым яго місія, пагаварылі са **старшынёй рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Алегам РАМАНАВЫМ**.

***— Алег Аляксандравіч, Усебеларускі народны сход — унікальны нацыянальны прававы вопыт, які не мае аналагаў у свеце. На ваш погляд, у чым яго асноўная, ключавая, функцыя?***

— Я вылучыў бы некалькі з іх. Па-першае, тое, што мы на новым этапе гістарычнага развіцця ўзнаўляем значны вопыт, які існаваў у нашай гісторыі. Гэта вопыт вечавых сходаў — напрыклад, Полацка і іншых старажытнарускіх гарадоў — і вырашэння пытанняў, якія важныя для кожнага чалавека. Таксама гэта вопыт земскіх сабораў. Ён сябе вельмі пазітыўна зарэкамендаваў у нашай гісторыі. Потым адбылася адмова ад гэтых палітычных інстытутаў па прычыне ўскладнення грамадства. Магчыма, былі пэўныя іншыя прычыны. Аднак сёння мы бачым, што такога роду формы ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадзянскай супольнасці з'яўляюцца значнымі, перспектыўнымі, атрымліваюць новае дыханне і новую актуальнасць. Гэты орган — Усебеларускі народны сход — дае магчымасць пачуць бачанне меркаванняў людзей з розных рэгіёнаў нашай краіны, якія сабраны ў адным месцы, могуць абмяркоўваць любыя значныя пытанні нашай дзяржавы. Другая важная функцыя — стабілізацыйная. Гэта функцыя ўмацавання палітычнай сістэмы, надання большай вагі і большага значэння тым рашэнням, якія будуць прымацца.

***— Размова ідзе пра 1200 тысяч дэлегатаў, якія прадставяць новы орган улады. Як будзе ажыццяўляць іх адбор?***

— Дэлегаты фарміруюцца трыма спосабамі. Па-першае, хто займае пэўныя пасады ў палітычнай, грамадскай сістэме нашай краіны і хто, зыходзячы з займанай пасады, будзе дэлегатам УНС: гэта Прэзідэнт, прэм'ер-міністр, члены ўрада, кіраўнікі выканаўчых камітэтаў рознага ўзроўню (абласнога, гарадскога, раённага), суддзі (Канстытуцыйнага, Вярхоўнага судоў). Іх удзел абсалютна неабходны — яны будуць прадстаўляць дзяржаву. Другая крыніца вылучэння дэлегатаў — Саветы дэпутатаў. Са сваіх шэрагаў яны будуць вылучаць дэлегатаў на Усебеларускі народны сход ад горада Мінска, абласцей, раёнаў і гарадоў нашай краіны. Такім чынам, дэлегатамі стануць тыя, каго яны і выбралі на выбарах у мясцовыя саветы. І трэцяя крыніца вылучэння дэлегатаў — суб'екты грамадзянскай супольнасці, якія маюць найбольшую вагу ў нашай краіне, зарэкамендавалі сябе як канструктыўныя грамадскія сілы. Яны таксама будуць накіроўваць сваіх членаў, актывістаў на Усебеларускі народны сход. Сукупна гэта складзе каля 1200 чалавек.

***— Чаму УНС неабходны Беларусі і беларусам?***

— Мы атрымалі ўнікальны гістарычны вопыт работы Усебеларускага народнага сходу ў ранейшыя гады, пачынаючы з 1996 года. Гэта найвышэйшы орган прамой дэмакратыі. Гэта ўзмацненне ролі народа ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Гэта новы канал сувязі паміж дзяржавай і грамадзянінам, дзяржавай і асобай. Усё гэта неабходна для складанай палітычнай сістэмы нашай краіны, для яе паспяховага развіцця з аднаго боку, з іншага — для забеспячэння яе стабільнасці і ўпэўненага руху ў будучыню.

***— Да сакавіка 2023 года, калі павінен быць прыняты законапраект, засталося не так шмат часу. Ці паспееце?***

— Зразумела. Законапраект знаходзіцца ў высокай стадыі гатоўнасці. Асноўныя канцэптуальныя палажэнні ў цэлым узгоднены ўсімі зацікаўленымі бакамі. Цяпер мы праводзім шырокае грамадскае абмеркаванне законапраекта, і парламент ва ўстаноўленыя тэрміны разгледзіць і прыме дадзены праект закона — у выніку ён набудзе сваю юрыдычную сілу.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Пяскоў: дакладнай даты завяршэння мабілізацыі пакуль няма

**Афіцыйны прадстаўнік Крамля Дзмітрый Пяскоў падчас брыфінгу расказаў, што дата завяршэння частковай мабілізацыі пакуль не названа.**

Па словах Пяскова, 14 кастрычніка прэзідэнт Пуцін гаварыў, што частковая мабілізацыя скончыцца прыкладна праз два тыдні.

«Нейкай больш дакладнай даты няма», — адказаў Пяскоў.

На пытанне журналіста, ці задаволены прэзідэнт ходам падрыхтоўкі мабілізаваных, Пяскоў адзначыў, што Пуцін працягвае трымаць гэтую тэму ў полі сваёй увагі.

«Пакуль пра канкрэтныя планы па іншых рэгіёнах паведаміць не магу. Пуцін жыва цікавіўся працэсам падрыхтоўкі, ён працягвае працаваць і трымаць гэта ў полі сваёй увагі», — падзяліўся Пяскоў.

Раней Уладзімір Пуцін і міністр абароны Сяргей Шайгу пабывалі на палігоне Заходняй ваеннай акругі ў Разанскай вобласці, дзе праходзяць падрыхтоўку мабілізаваныя. Пуцін сустрэўся з мабілізаванымі і праверыў, як праходзяць заняткі па тактычнай, агнявой, інжынернай і медыцынскай падрыхтоўцы. Таксама прэзідэнт апрабаваў снайперскую вінтоўку Драгунава, зрабіўшы з яе некалькі стрэлаў.

## The Guardian: Берлусконі словамі аб Зяленскім справакаваў палітычны скандал у Італіі



**Былы прэм'ер-міністр Італіі Сільвія Берлусконі сваёй заявай аб тым, што прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі «справакаваў» спецаперацыю Расіі ў сваёй краіне, выклікаў новы палітычны скандал і пагрозу стабільнасці новага ўрада Італіі ўсяго за некалькі дзён да таго, як ён, як чакаецца, прыйдзе да ўлады, піша The Guardian.**

Агенцтва La Presse раней апублікавала запіс, на якім можна пачуць, як Берлусконі абараняе свайго «старога сябра» прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і кажа, што Зяленскі справакаваў пачатак Масквой баявых дзеянняў, «патроіўшы атакі» на падтрымліваных Расіяй апалчэнцаў у Данбасе.

Паводле яго слоў, з-за падтрымкі Украіны з боку Захаду спецаперацыя «ператварылася ў 200-гадовую вайну».

Гэтыя выказванні выклікалі скандал у правай кааліцыі на чале з Джорджыяй Мелоні: яна павінна быць прыведзена да прысягі ва ўрадзе на наступным тыдні. Мелоні паабяцала прадоўжыць падтрымку Італіяй Украіны і захаваць санкцыі ЕС супраць Расіі.

## Нарвежскі стартап ператварае пясок пустыні ва ўрадлівую глебу за сем гадзін

**Заснавальнікі стартапу Desert Control з Нарвегіі сцвярджаюць, што іх праект здольны ператвараць пясок пустыні ва ўрадлівую глебу ўсяго за сем гадзін, піша Oddity Central.**

Як расказалі супрацоўнікі кампаніі, сакрэтным інгрэдыентам у працэсе ператварэння з'яўляецца нанагліна, вынайдзеная ў пачатку 2000-х гадоў нарвежскім вучоным Крысціянам Алесенам. Яна ўступае ў сувязь з часціцамі пяску і ўтварае вільгацеўтрымлівальную глебу.

Desert Control скіравана на ААЭ, дзе каля 90 працэнтаў прадуктаў прывозяць з-за мяжы, таму што вырошчваць штосьці ў гэтым пустэльным асяроддзі вельмі складана. Кошт стартапу вагаецца ад $2 да 5$ за квадратны метр, што даволі нятанна, улічваючы велізарныя плошчы, неабходныя пад сельскагаспадарчыя праекты.

«Калі яны змогуць знізіць цану і зрабіць яе даступнай для краін з найменшым даходам, гэта можа аказаць вялікі ўплыў на харчовую бяспеку і здольнасць многіх з гэтых краін выкарыстоўваць свае ўласныя культуры», — лічаць эксперты.

Спецыяльны рэпартаж

# НА ВАРЦЕ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ

## Карэспандэнты «Звязды» высвятлялі, хто адказвае за якасць прадукцыі, што трапляе ў воінскія часці



**Бацькам, якія адпраўляюць сваіх дзяцей у армію, абсалютна не варта хвалявацца аб тым, чым у найбліжэйшыя год-паўтара будуць харчавацца іх дзеці. Па-першае, рацыён сённяшняга ваеннаслужачага разнастайны, у чым неаднаразова давялося пераканацца падчас камандзіровак у войскі. Па-другое, якасці прадуктаў тут удзяляецца асаблівая ўвага — харчовая бяспека асабовага складу з'яўляецца найважнейшым элементам боегатоўнасці любой арміі. Беларуская — не выключэнне.**

За якасць прадуктаў, якімі харчуюцца ваеннаслужачыя, адказвае Цэнтральная ветэрынарная лабараторыя Узброеных Сіл, якая акрэдытавана на адпаведнасць патрабаванням міжнароднага стандарту. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ва ўнікальным падраздзяленні, дзе на свае вочы пераканаліся, што прадукцыя, якую спажываюць абаронцы Айчыны, знаходзіцца на асаблівым кантролі.

### І якасць, і колькасць

Своеасаблівая экскурсія па лабараторыі пачалася з аддзела нагляду якасці і харчовай бяспекі харчавання. Тут кантралююць якасць харчовай сыравіны і ўжо гатовых прадуктаў, якія трапляюць для патрэб Узброеных Сіл.

— Прадукты, якія набывае Міністэрства абароны, паступаюць на склады харчовых баз і воінскіх часцей, — расказвае **намеснік начальніка Цэнтральнай ветэрынарнай лабараторыі Узброеных Сіл — начальнік аддзела нагляду маёр Вадзім ЛУКАШЭВІЧ.** — Згодна з пэўнай методыкай, там адбіраюць спробы і накіроўваюць іх у ветэрынарную лабараторыю. Да нас на экспертызу трапляюць розныя прадукты харчавання: пачынаючы ад кансерваванай прадукцыі, заканчваючы макароннымі вырабамі, крупамі, пячэннем, сокамі.

Усё, што з'яўляецца на стале салдата і афіцэра, праходзіць пільны кантроль. Адпаведную праверку праходзіць і хлеб, асабліва той, які быў спечаны ў палявых умовах. У лабараторыю такі хлеб не вязуць, экспертызу праводзяць на месцы прыгатавання.

У ветэрынарнай лабараторыі спецыялісты ў першую чаргу правяраюць, ці адпавядаюць характарыстыкі, заяўленыя на ўпакоўцы прадукту, яго зместу. Тое, што заяўлена вытворцам, абавязкова павінна адпавядаць якасці. Калі ж прадукты харчавання нядобраякасныя, іх бракуюць — адпаведна, яны ніколі не паступяць на стол вайскоўцам. Няякасную прадукцыю вяртаюць пастаўшчыку. Ён павінен або яе замяніць, або вярнуць грошы.

Акрамя таго, спецыялісты лабараторыі правяраюць колькасць прадукцыі, заяўленую вытворцам. Напрыклад, на бляшанцы з рыбнымі кансервамі ўказана адна маса прадукту, а ў рэальнасці яна іншая. Бывае, што гатунак макароны або мукі не адпавядае таму, што напісана на этыкетцы. Такія прадукты таксама не паступяць у вайсковыя часці.

### Стэрыльнасць — перш за ўсё

Прадукцыя, якая трапляе ў лабараторыю, у абавязковым парадку праходзіць праз аддзяленне мікрабіялогіі. Задача спецыялістаў — вызначыць наяўнасць або адсутнасць у канкрэтным прадукце патагенных мікраарганізмаў.

— На першапачатковым этапе аглядаецца ўпакоўка, правяраецца маркіроўка, наяўнасць дэфектаў, — расказвае **лабарант аддзялення мікрабіялогіі Дар'я ГЕРАСКІНА.** — Затым пэўная



колькасць спробы прадукту знаходзіцца на працягу ад трох да сямі дзён пад пэўнай тэмпературай у тэрмастаце. Пасля таго як мы праверылі прадукт на герметычнасць упакоўкі, бяром частку прадукцыі і ў ламінарным боксе праводзім пасеў на выяўленне патагенных мікраарганізмаў. Адразу нічога не ўбачым. Калі там нешта не ў парадку, заўважым гэта прыкладна на трэція суткі. Такі прадукт, зразумела, не прыдатны для спажывання. Калі ж за вызначаны час з пробамі ніякіх змен не адбылося, значыць, прадукт якасны і яго можна ўжываць.



Дар'я Гераскіна адзначае, што за год, які яна працуе ў ветэрынарнай лабараторыі, па мікрабіялагічных даследаваннях праблем з прадукцыяй не ўзнікала. «Часам прыходзіць пампажная ўпакоўка або ўпакоўка з іншымі дэфектамі — такая прадукцыя па ўстаноўленых правілах далейшаму даследаванню не падвяргаецца», — удакладняе спецыяліст.

У асобным памяшканні пільная ўвага ўдзяляецца рыбе, якая правяраецца на наяўнасць гельмінтаў або іншых паразітаў. Рыба трапляе ў лабараторыю ў замарожаным стане. На працягу 24 гадзін яе размарожваюць, затым разразаюць і даследуюць брушную поласць, мяса на наяўнасць гельмінтаў. Калі ўзнікаюць пытанні, прадукт вывучаюць пад мікраскопам. Калі ён прыдатны для ўжывання, вызначаецца якасць рыбы, у выніку чаго робіцца заключэнне, з якой мэтай яе можна выкарыстоўваць.

### Без радыяцыі і лішняй вільгаці

На наступным этапе прадукцыя правяраецца на наяўнасць радыеактыўных рэчываў. Радыеметрычны кантроль праводзіць ветэрынарны **ўрач аддзялення экспертызы Андрэй БОТТЭ.** Падчас наведвання карэспандэнтамі лабараторыі на экспертызе ў спецыяліста знаходзіўся сок.

— Пэўны аб'ём спробы (у нас гэта літр соку) змяшчаецца ў сасуд Марынэлі, які адпраўляем у прыбор гама-бэта-спектрометр, — уводзіць у курс справы ветэрынарны спецыяліст. — Затым даныя, якія характарызуюць прадукт, уводзяцца ў камп'ютар. Праз некаторы час ён выдае вынік. Як правіла, нас хвалюе наяўнасць у прадукце цэзію-137.

Колькі Андрэй працуе ў лабараторыі, яшчэ ніколі не ўбачыў у прадуктах перавышэння радыенуклідаў. Гэта не можа не радаваць, бо сведчыць аб тым, што з наступствамі чарнобыльскай катастрофы наша краіна паспяхова спраўляецца.

І калі пытанняў па радыеметрыі апошнім часам не ўзнікае, то гэтага не скажаш аб фізіка-хімічных паказчыках прадукцыі. Фізіка-хімічныя даследаванні спроб праводзяцца ў памяшканні для тэрмічнай апрацоўкі. Падчас нашай прысутнасці там правяралі на вільготнасць пячэнне. Спецыялісты сцвярджаюць: гэта важны паказчык, бо калі ён не адпавядае норме, то пячэнне пачынае псавацца, а гэта ўплывае на захоўванне прадукту.

— З таго, што ўдавалася даследаваць, часцей за ўсё завышаная вільготнасць сустракаецца менавіта ў пячэнні, — расказвае Андрэй Боттэ. — Бывае, што высокая вільготнасць вызначаецца ў муцэ і цукры. Акрамя таго, мука, як і крупы, часцей за ўсе прадукты не праходзяць кантроль з-за заражанасці шкоднікамі.

Дзякуючы спецыяльнаму абсталяванню, правяраецца і наяўнасць сухога рэчыва ў прадукце. Асабліва на кантролі спецыялістаў — сокі, якія некаторыя вытворцы могуць разбаўляць вадой. Наяўнасць лішку соды ў мучным вырабе — таксама падстава для бракавання прадукцыі.

### Карысныя вітаміны

У аддзяленні ветэрынарна-санітарнай экспертызы ажыццяўляецца даследаванне садавіны і гародніны. У асноўным на кантролі яблыкі, бульба, буракі, морква, цыбуля, белакачанная капуста — тое, што часцей за ўсё з'яўляецца ў рацыёне ваеннаслужачых.

— Да нас паступілі ўзоры буракоў, якія мы спачатку рыхтуем, — распавядае **лабарант аддзялення ветэрынарна-санітарнай экспертызы Анастасія СЫНКОВА.** — Мыем, высушваем, адразаем пярэднюю і заднюю часткі, дзелім на кавалкі. Адну чацвёртую частку ад кожнага бурака здрабняем да аднастайнай масы, затым узважваем 10 грамаў і дабаўляем 50 мілілітраў гатовага раствору. Усё перамешваецца магнітнай мяшалкай, пасля чаго адпраўляецца ў спецыяльны прыбор — іонамер, які вызначае колькасць утрымлівання нітратаў у гародніне.

Спецыялісты кажуць, што нітраты прысутнічаюць у гародніне заўсёды. Часцей — у бураках і зяляніне, асабліва ў ранняй. У фруктах, акрамя яблыкаў і бахчавых, іх увогуле практычна не бывае. Дарэчы, некаторая колькасць нітратаў сыходзіць разам са зрэзанай лупінай. Колькасць нітратаў залежыць ад сезоннасці, угнаенняў, унесеных у грунт. У прадукцыі, якая паступае на экспертызу, штогод выяўляецца перавышэнне нормаў па ўтрыманні нітратаў, у некаторых выпадках — больш чым у некалькі разоў. Такая партыя гародніны не паступае ў воінскія часці.

— Калі ў пастаўшчыка ўзнікаюць пытанні, праводзіцца паўторнае даследаванне, — адзначае Вадзім Лукашэвіч. — З гэтай мэтай бяруцца іншыя спробы. Бывае, што на экспертызу трапляе гародніна з павышанай колькасцю нітратаў, чаго не скажаш аб усёй партыі. Да прафесіяналізму нашых спецыялістаў рэдка ў каго ўзнікаюць пытанні: лабараторыя пастаянна пацвярджае сваю кампетэнтнасць і бесстароннасць. Дарэчы, часцей за ўсё лабараторыя бракуе прадукцыю расліннага паходжання.

Што яшчэ ў свой час не прайшло кантроль, можна даведацца ў музеі забракаванай прадукцыі, які размяшчаецца ў ветэрынарнай лабараторыі. У своеасаблівай экспазіцыі, напрыклад, — кісель, які не прайшоў экспертызу з-за павышанай вільготнасці. Тут і сухафрукты з кавалкам поліэтылену ў іх складзе, і нявкасныя кансервы, і крупы, у якіх выявілі шкоднікаў, — адным словам, усё, што не адпавядае патрабаванням стандартаў.

Варта адзначыць, што на даследаваннях у лабараторыі кантроль якасці харчавання ваеннаслужачых не заканчваецца. «Нашы спецыялісты выязджаюць у воінскія часці, правяраюць сталовыя, склады — ажыццяўляецца ветэрынарна-санітарны кантроль прадукцыі на месцах, — заўважае намеснік начальніка Цэнтральнай ветэрынарнай лабараторыі Узброеных Сіл — начальнік аддзела нагляду. — Там мы правяраем умовы захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў».

### Дапамога і прафілактыка

Даследуюць у лабараторыі і корм для службовых сабак — гэтыя незаменныя памочнікі вайскоўцаў таксама павінны якасна харчавацца. А яшчэ ім аказваюць лячэбную дапамогу, праводзяць прафілактычныя мерапрыемствы.

— Мы аказваем тэрапеўтычнае, хірургічнае, стаматалагічнае лячэнне службовых сабак, — канкрэтызуе **загадчык першага ветэрынарнага ўчастка Таццяна АРЛОВА.** — Таксама праводзім мерапрыемствы па недапушчэнні распаўсюджвання захворванняў, агульных як для чалавека, так і жывёл. Вакцынуем службовых сабак ад шаленства. Стаім на абароне здароўя як людзей, так і службовых сабак. Гэта нашы байцы нябачнага фронту, якія працуюць у палях, лясах, шукаюць міны, стаяць на пасту, не дазваляюць ворагам трапіць на нашу тэрыторыю.

У асноўным тут абслугоўваюцца чатырохлапыя байцы з воінскіх часцей Узброеных Сіл. Пацыенты рознапародныя. Як высветлілася, для кожнай пароды характэрна пэўнае захворванне. «Напрыклад, нямецкія аўчаркі найбольш схільныя да захворванняў апорна-рухальнай сістэмы, — расказвае Таццяна Арлова. — І гэта зразумела: на іх ускладзена вялікая нагрузка па прачэсванні вялікіх участкаў мясцовасці — у асноўным гэта датычыцца патрульных, каравульных сабак. Сезонныя захворванні, якія назіраюцца не толькі ў людзей, але і ў сабак, імкнёмся папярэдзіць. Своечасова праводзім дэгельмінтызацыю, дэзынсекцыю, вакцынуем. Таксама дэзынфіцыруем вальеры, месцы, дзе яны нясуць службу. Кожны месяц выязджаем у воінскія часці, дзе праводзім дыягнастычныя агляды, штогод адбываецца дыспансерызацыя сабак.

Дарэчы, звярнуцца па дапамогу да вайсковых ветэрынараў могуць і чатырохлапыя пацыенты, якія не служаць ва Узброеных Сілах. Шырокі спектр паслуг для грамадзянскіх асоб ажыццяўляецца тут на платнай аснове.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Бяспека

# ДЗЕЛЯ ЗАХАВАННЯ МІРУ

## Рэгіянальная групоўка войск (сіл) Беларусі і Расіі выконвае задачы па абароне Саюзнай дзяржавы

**Прыняцце такіх мер абумоўлена павышэннем узроўню пагроз у адносінах даваеннай бяспекі нашай краіны, у цэлым Саюзнай дзяржавы. На працягу апошніх гадоў дзяржавы Паўночнаатлантычнага альянсу нарошчваюць свой ваенны патэнцыял каля нашых граніц. Польшча і краіны Балтыі ўдасканальваюць ваенную інфраструктуру, у тым ліку шляхам стварэння новых ваенных аб'ектаў у прыгранічных з намі раёнах. Фарміруюцца і новыя воінскія злучэнні, якія валодаюць сучасным наступальным узбраеннем.**

Як паведаміў **намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі па навуковай рабоце палкоўнік Віктар ТУМАР**, рашэнне аб стварэнні Рэгіянальнай групоўкі войск (сіл) на нашай тэрыторыі прынята для забеспячэння парытэту ў галіне ваеннай бяспекі, а таксама для далейшага захавання міру. «Яе аснову складаюць Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь у штатах мірнага часу, а таксама асобныя воінскія фарміраванні Расійскай Федэрацыі, — удакладніў прадстаўнік Генштаба. — Рэгіянальная групоўка войск (сіл) Саюзнай дзяржавы з'яўляецца выключна абарончым праектам. У цяперашні час рашэнне аб стварэнні Рэгіянальнай групоўкі войск (сіл) рэалізуецца ў інтарэсах узмацнення аховы і абароны Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, а таксама з мэтай зніжэння ваеннай актыўнасці ў прыгранічных з намі раёнах».

На тэрыторыю нашай краіны ўжо прыбылі воінскі расійскага складніку Рэгіянальнай групоўкі войск (сіл). З ваеннаслужачымі праводзяцца планавыя мерапрыемствы баявой падрыхтоўкі, накіраваныя на павышэнне ўзроўню выканання задач па абароне суверэнітэту Саюзнай дзяржавы.

Як расказаў на Мінскім трактарным заводзе **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН** падчас інфармавання па пытаннях ваенна-палітычнай абстаноўкі, якая складваецца ў краіне і за мяжой, з моманту стварэння гэтага абароннага кампанента Саюзнай дзяржавы ў ходзе вучэнняў адпрацаваны розныя варыянты разгортвання і прымянення РГВ. «Мы на практыцы апрабавалі як адначасовае разгортванне ўсіх сістэм у выпадку ідавочнай пагрозы, так і паэтапнае іх разгортванне ў адпаведнасці з умовамі абстаноўкі, — заўважыў кіраўнік абароннага ведамства. — Сёння, зыходзячы з абстаноўкі, якая складваецца, мы дзейнічаем паэтапна, рэалізуем асобныя мерапрыемствы, накіраваныя на папераджальную гатоўнасць рэгіянальнай групоўкі да рэагавання на выклікі і пагрозы, якія ўзнікаюць. Мы ўпэўнены: гэта гарантуе бяспеку па ўсім перыметры граніц Саюзнай дзяржавы ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі».

Пры гэтым міністр абароны акцэнтаваў увагу, што ўсе мерапрыемствы, якія праводзяцца ваенным ведамствам, з'яўляюцца рэакцыяй на дзеянні нашых апанентаў. «Мы ні на кога не збіраемся нападаць, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Задачы гэтай групоўкі выключна абарончыя, а ўсе мерапрыемствы, якія праводзяцца цяпер, накіраваны на адэкватнае рэагаванне на тое, што адбываецца паблізу нашых граніц. У цэлым жа мы лічым, што рэалізаваныя цяпер і сплянаваныя меры стратэгічнага стрымлівання Узброенымі Сіламі забяспечваюць дэманстрацыю гатоўнасці да абароны нашай краіны і нанясення непрымальнай шкоды агрэсару. Але ўсё ж асновай нашай ваеннай палітыкі застаецца пазіцыя, што больш мэтазгодна не бразгаць зброяй, а садзіцца за стол перагавораў і дамаўляцца».

Міністр абароны запэўніў, што людзі ў пагонах дакладна ведаюць сваю задачу, кантралююць абстаноўку, праводзяць комплекс прэвентыўных мерапрыемстваў для выканання той задачы, якую паставіў кіраўнік дзяржавы. «Перш за ўсё — не дапусціць развязвання ўзброенага канфлікту на тэрыторыі Беларусі, — абазначыў Віктар Хрэнін. — Мы гэта робім прафесійна і са сваімі задачамі справімся».

**Вераніка КАНЮТА.**

Май на ўвазе!

# НЯМА НАГОДЫ ДЛЯ НЕСПАКОЮ

## Зверка ўліковых даных ваеннаабавязаных, якая праводзіцца, ніяк не звязана з мабілізацыяй

**На фоне частковай мабілізацыі ў Расійскай Федэрацыі дэструктыўныя тэлеграм-каналы палохаюць нашых суайчыннікаў аб падобных мерапрыемствах у Беларусі. Галоўнакамандуючы, Міністэрства абароны неаднаразова заяўлялі: ніякай мабілізацыі ў нашай краіне няма і не прадугледжваецца. Усе планавыя мерапрыемствы па ўліку ваеннаабавязаных праводзяцца ў ранейшым рэжыме.**

Святкаванне юбілею прайшло ўчора ў сталічным Палацы Рэспублікі. Як адзначыла **дырэктар РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі Анжаліка СОНЦАВА**, штогод шэсць тысяч дзяцей лечацца ў стацыянарах цэнтра, 40 тысяч наведваюць яго спецыялістаў амбулаторна, праведзена больш за 1400 трансплантацый. Штогод выконваецца больш за 70 трансплантацый гемапаэтычных ствалавых клетак, прыкладна 6 % з іх — дзецям з замежжа.

— Дваццаць пяць гадоў для медыцынскай установы — не вельмі вялікая дата. Але насамрэч за ёй стаіць шмат падзей, перамог і адкрыццяў. Апошнія гады мы працуем на апераджэнне. Наш навуковы аддзел практыкаарыентаваны і валодае самымі перадавымі тэхналогіямі. Гэта метады клетачнай тэрапіі, імунатэрапіі, імунапрафілактыкі. Сёння ў нас пяцігадовая выжывальнасць дасягнула 82 %, а па некаторых відах анкалагічных хвароб — да 90 %. Я вельмі спадзяюся, што хутка гэта лічба будзе набліжацца да 100 % і мы зможам сказаць, што перамаглі дзіцячы рак, — сказала дырэктар РНПЦ.

Дзіцячы цэнтр знаходзіцца пад патранатам Савета Рэспублікі: ад дапамогі ў набыцці неабходнага абсталявання да арганізацыі мерапрыемстваў і свят для дзяцей. Сенатары ўдзельнічаюць у акцыях «Нашы дзеці», аказваюць падтрымку малым да 1 верасня.

— У нас створаны папячыцельскі савет, яго члены збіраюцца і вырашаюць праблемы цэнтра, абмяркоўваюць тое, што варта зрабіць, — расказвае **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ**. — Цэнтр намі быў абраны невыпадкова, бо аказанне дапамогі дзецям блізкае кожнаму чалавеку. Прычым гэта дзеці з няпростым лёсам. Хочацца, каб людзі, якія працуюць у гэтым цэнтры, заўсёды мелі магчымасці ім дапамагчы.

**Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ** падкрэсліў, што анкалогію прынята лічыць хваробай пажылых людзей. Улічваючы гэта, дзіцячая анкалогія з'яўляецца больш знакавай і адказнай галіной.

— Для нас РНПЦ — гэта своеасаблівы сімвал педыятрыі, якая з'яўляецца маркай айчыннай аховы здароўя. Дзіцячая анкагематалогія — гэта і сімвал высокіх тэхналогій, сімвал комплекснага падыходу. Самае важнае — не колькі юных пацыентаў мы пралячылі, а выжывальнасць, якая з'яўляецца адной з найлепшых у свеце. Гэта таксама персаніфікаванае лячэнне, калі тактыка і прэпараты падбіраюцца кожнаму дзіцяці індывідуальна. З гэтым мы прыйшлі да 25-годдзя, а значыць, і ў будучыні цэнтр застанецца перадавым.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Калі надыдуць халады...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Футравыя аксесуары — тое, што прыўнясе гэтая зіма ў наш гардэроб. Абутак, сумкі, галаўныя ўборы са штучным футрам — усё гэта можна ўбачыць у калекцыях Bottega Veneta, Versace і Gucci. Асабліва цікавыя мініяцюрныя футравыя сумачкі і бацільёны з футравым аздабленнем — не надта практычна, але вельмі прыгожа!

— Калі казаць пра кажушкі і паліто з экафутра, то тут, безумоўна, нельга не ўспомніць пра дызайнера Вольгу Люціч, — распавядае стыліст Ірына Грыцук. — Экафутра — адзін з яе любімых матэрыялаў, і калекцыі з яго яна стварае ўжо не першы халодны сезон. Некаторыя беларускія модніцы іх даўно ацанілі. У новай калекцыі (брэнд так і называецца — «Вольга Люціч»: @brand_olga_lyutich) можна знайсці вельмі актуальныя мадэлі для дзяцей і падлеткаў на рост да 160 см. Калі мама невысокая, яна цалкам можа падабраць што-небудзь і для сябе.

Але важна памятаць, што ў кажушку са штучнага футра будзе цёпла і ўтульна толькі да 10—15 градусаў марозу, кажа Ірына. Так што, улічваючы непастаянны і непрадказальны характар беларускай зімы, у зімовым гардэробе не абысціся без ***пухавіка***. Зразумела, прашыванага. Хоць у дачыненні да пухавікоў мода гэтай зімой неверагодна дэмакратычная. Актуальныя мадэлі пухавікоў 2022/2023 года — гэта самыя розныя варыянты крою, ад класічнага прамога фасону да асіметрычных формаў. Даўжыня трэндавага пухавіка таксама любая. Згаджаецца мода гэтай зімой і на мідзі, і на максі, актуальныя і кароткая, і зусім скарочаная даўжыня пухавіка. Аб'ядноўвае ўсе гэтыя варыянты дызайн у аверсайз-стылі, дзякуючы чаму вобразы атрымліваюцца нядбайнымі і разняволенымі, а жаноцкасці дадае колеравая гама — у трэндзе далікатныя адценні. Хоць і карычневая гама не здае пазіцый.

— Трэнд на прашыванае аздабленне дадае вобразу эстэтыкі, уносіць нотку класікі ў расслаблены аверсайз-вобраз і робіць яго больш гарманічным, — адзначае стыліст.

Актуальныя дызайнерскія пухавікі яна раіць шукаць у той жа Вольгі Люціч (у яе калекцыі таксама ёсць модныя гэтай восенню «пуховыя» камізэлькі: яны не страцяць актуальнасці і зімой, калі насіць іх «ніжнім пластом»). А калі казаць аб масавым вытворцы, то гэта, вядома, апошнія калекцыі «ELEMA» і «Panda».

— На гэтую зіму ў беларускіх дызайнераў ёсць цікавыя мадэлі — напрыклад, пухавікі з каўняром-шалікам, якія дазваляюць атрымаць актуальны «надзіманы» каўнер.

Прашываныя рэчы цяпер на грэбні моднай хвалі, і гэта не толькі пухавікі: у трэндзе прашываныя сумкі, абутак і галаўныя ўборы ў тым жа стылі, распавяла Ірына.

Паколькі беларуская зіма пераменлівая і можа быць як вельмі халоднай, так і нечакана папесціць цяплом, раскажам таксама аб ***куртках-кашулях***. Яны перавандруюць у зімовую моду з восені і стануць «знаходкай» для адліг, але наогул, кажа Ірына, гэты трэнд ужо сыходзіць.

— Такія курткі былі на піку ў мінулых сезонах, хоць і сёння яшчэ актуальныя. Упішуцца яны не ў любы гардэроб — падыдуць у першую чаргу творчым людзям. У іх гардэробе (з пэўным чынам падабранымі рэчамі ў стылях кэжуал і боха) гэтая досыць яркая і самабытная рэч можа стаць асновай многіх вобразаў.

## БРЭНДЫ І ТРЭНДЫ

Сакрэт, якога не ведаюць жыхары цёплых краін і які добра вядомы тым, хто пражывае ў нашым клімаце: самае цёплае футра не сагрэе, калі надзець яго на майку. На шчасце, ***шматслойнасць*** па-ранейшаму актуальная. Халады даюць прастору для стыльных эксперыментаў — магчымасць мяняць месцамі пласты і ствараць крэатыўныя камбінацыі. Гэты момант — патэнцыйную камбінатыўнасць той ці іншай рэчы — варта ўлічваць, адпраўляючыся на шопінг.



**Трэнд на прашыванае аздабленне пухавіка дадае вобразу эстэтыкі.**

Але, дарэчы, якія айчынныя калекцыі заслугоўваюць увагі?

— Актуальныя рэчы, асабліва для моладзі і падлеткаў (а таксама для тых, хто малады душой) можна знайсці ў новых калекцыях «Калінкі», «Купалінкі» і «Світанка», — распавядае стыліст. — Гэтыя брэнды мамы школьнікаў і студэнтаў ацанілі ўжо даўно: іх фішка — вельмі нядрэнныя калекцыі дзелавога адзення.

Вяртаючыся да тэмы моднай зімы, таксама абавязкова трэба сказаць пра брэнд «НашаМода», адзначыла Ірына.

— Гэты брэнд на рынку ўжо больш за 12 гадоў. Ён аб'яднаў таленавітых вытворцаў беларускага трыкатажу. У інтэрнэт-краме брэнда падбяруць што-небудзь нават самыя капрызныя.

Але пагаворым аб трэндах у цэлым.

— І гэта, у прыватнасці, ***прынт «гусіная лапка»***. Гэты прынт заяўляе пра сябе кожны халодны сезон, але наступнай зімой ён — на піку. Яго дадаюць усюды — нават на кішэні і каўняры пухавікоў-аверсайз. І гэта, на мой погляд, некаторы перабор. Словам, у дачыненні да гэтага прынта (як і любога іншага трэнду) мая парада — суадносіць модныя тэндэнцыі са здаровым сэнсам і добрым густам.

***Аверсайз***, як ужо было сказана, нікуды не сышоў, ён па-ранейшаму з намі. Але ў гэтым сезоне ён набыў новыя рысы.

— Шырокі верх + шырокі ніз — болей не актуальнае спалучэнне, яно засталося ў мінулых сезонах. Цяпер аверсайз спалучаем з рэчамі па памеры. Прынцып просты: калі выбіраеце шырокі верх, ніз павінен быць вузкі. І наадварот: трэндавыя шырокія джынсы спалучаем з верхам па памеры, — раіць Ірына.

Заўважым, што ў гэтым халодным сезоне крэатыўныя дырэктары модных дамоў рэкамендуюць насіць максімальна шырокія джынсы з высокай пасадкай — натхняемся калекцыямі Balmain, Givenchy і Acne Studios.

— Калі вельмі хочацца надзець шырокі верх пад такі вось шырокі ніз — хай гэта будзе кашуля, пінжак ці талстоўка на маланцы, надзетыя на топ або бодзі і расшпіленыя. У крайнім выпадку, калі верхняя рэч шырокая і без зашпількі, варта хоць бы заправіць яе краёчак у шырокія штаны ці спадніцу, каб пазначыць талію і зрабіць вобраз больш сабраным і стройным.

Дарэчы, ***пра талію***. Яна па-ранейшаму пераважна высокая, што б там модныя аналітыкі ні пісалі пра джынсы і штаны з нізкай пасадкай. Сакрэт просты: нізкая талія падыходзіць толькі ідэальным постацям «нябесных істот» — мадэляў, большасць жа з нас — проста людзі, са сваімі схільнасцямі да смачнай і не заўсёды здаровай ежы. А высокая пасадка спадніц і джынсаў дазваляе больш надзейна схаваць наступствы любові да шакаладу і пірожных. Але ўсім, хто настальгіруе па 2000-х, таксама не варта засмучацца: мода прапануе міні, нягледзячы на халодны сезон. Гламурная эпоха «нулявых» вярнулася на подыумы міні-спадніцамі з дэніму, скуры, тонкага трыкатажу, воўны. Насіць іх рэкамендуецца з чым заўгодна — світарамі і кроп-світарамі, кашулямі, пінжакамі і гэтак далей. А таксама з акцэнтнымі калготкамі: іх гэтай зімой раяць падбіраць не толькі ў тон асноўнаму вобразу, але і кантраснага колеру, спалучаючы з міні-спадніцамі, сукенкамі і шортамі (па прыкладзе Chanel). Але і з міні, і з каляровымі калготкамі ўсё якраз складана — гэта свайго роду «лакмусавая паперка» вашага бездакорнага густу, і калі вы ў ім не зусім упэўнены, лепш не рызыкаваць.

— Тут таксама можна згадаць актуальны трэнд на грубую вязку шкарпэтак і гетраў, — адзначае Ірына. — Даводзілася бачыць, як нашы модніцы, не разабраўшыся ў нюансах, надзяваюць шкарпэткі звычайнай фабрычнай вязкі, падцягваюць іх як мага вышэй, а абутак выбіраюць любы, нават бацільёны. Здавалася б, якая розніца? Але калі гаворка ідзе пра такія складаныя і спрэчныя трэнды, важна ўлічыць усё: і вязку шкарпэтак або гетраў, і фасон абутку. Тое ж самае з міні-спадніцай (тым больш калі вам ужо не 18 гадоў). Асабліва — з міні ў спалучэнні з яркімі калготкамі. Выбіраючы такі вобраз, важна максімальна дакладна прадумаць яго цэласнасць: ад каляровай гамы да фасону сумкі і вашага макіяжу. І самае галоўнае — улічыць нюансы фігуры. Таму што няправільна падабраны look з разраду «ўльтрамодных» здольны сапсаваць знешнасць самай прыгожай дзяўчыны.

## І, НАРЭШЦЕ, АКСЕСУАРЫ

— Што датычыцца галаўных убораў, адзін з асноўных трэндаў надыходзячай зімы — берэты, прычым не бесказыркі, а ***берэты з казырком***.

А калі казаць пра сумачкі, то, у прынцыпе, яны могуць быць самымі рознымі, але на піку папулярнасці — «памеру XXL», у першую чаргу ***шоперы***.

— Не ўсе стылісты ў захапленні ад шопераў — многія кажуць пра іх «бабуліна авоська», — тлумачыць Ірына. — Але мне здаецца, шопер — гэта зручна, практычна і прыгожа. І такую сумку можна ўпісаць амаль у любы вобраз.

***Абутак на зіму 2022/2023*** — тэма для асобнай гутаркі са стылістам. Скажам толькі, што сярод фаварытаў абутковых трэндаў — па-ранейшаму трактарная падэшва, грубыя чаравікі, бацільёны на платформе, нізкі ход або тоўсты ўстойлівы абцас.

— Калі, абнаўляючы зімовы гардэроб, вы задумаліся аб новай пары актуальнага абутку, можна звярнуцца да трэнду «Нашы боты». Ён прапануе шырокі асартымент жаночага (а таксама мужчынскага) абутку, і ў апошніх калекцыях можна знайсці цікавыя мадэлі. У цэлым на нашым модным рынку ёсць годныя вытворцы і брэнды. І на іх варта звярнуць увагу.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Волковысский машиностроительный завод», Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Эстакада железобетонная** (Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. № 410/С-32727, общ. пл. 28,5 кв. м, по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31/24, эстакада железобетонная. ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен Продавцу на праве аренды для строительства и обслуживания сооружения эстакады железобетонной, общ. пл. 0,0757 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 6 720 бел. руб.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу и организатору торгов на их проведение и оплатить установленное вознаграждение организатору торгов 10 % от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.08.2022 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.11.2022 с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **02.11.2022** до **17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу.**

**Аукцион состоится 23.11.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-161442 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – гаражи механической мастерской), площадью 308,1 кв. м, Гродненская обл., г. Гродно, ш. Озерское, 16А. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001006834, площадью 0,1269 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания гаражей), расположенном по адресу г. Гродно, ш. Озерское, 16А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании в виде сервитута на неопределенный срок без оплаты, площадью 0,0183 га, с целью прохода и проезда в любое время суток. Условия проведения аукциона: оплату за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |
| **Начальная цена продажи** | 164 848,66 руб. (сто шестьдесят четыре тысячи восемьсот сорок восемь рублей 66 копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 16 484 руб. (шестнадцать тысяч четыреста восемьдесят четыре рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **21 ноября 2022 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

Падзея

# ГЛАБАЛЬНЫ РАСКЛАД

## Чым адметны XX з'езд КПК?

**XX з'езд Камуністычнай партыі Кітая, які адкрыўся ў мінулую нядзелю ў Доме народных сходаў у Пекіне, без перабольшвання можна назваць ключавой падзеяй глабальнага парадку дня. У топе навінавых стужак усіх інфармацыйных агенцтваў — менавіта матэрыялы з Паднябеснай.**

Маштабы — насамрэч кітайскія. Для ўдзелу ў з'ездзе з усёй краіны ў Пекін з'ехаліся 2296 дэлегатаў, якія прадстаўляюць амаль 100 мільёнаў членаў КПК. «Каб расказаць усяму свету пра XX з'езд Кампартыі, сюды з'ехаліся больш за дзве тысячы журналістаў з Кітая і іншых краін», — паведаміў намеснік кіраўніка прэс-цэнтра партыйнага форуму Лю Сыян. Цырымонію адкрыцця стратэгічнага форуму перадавалі ў прамым эфіры Медыякарпарацыя Кітая і Xinhuanet. Акрамя таго, яна транслявалася на тэлеканалах і радыёстанцыях па ўсім Кітаі, а таксама на сайтах навін, платформах новых медыя, вялікіх экранах на адкрытым паветры і на мабільных тэлеэкранах. Функцыянальныя зоны прэс-цэнтра размешчаны ў двух пекінскіх гатэлях — Beijing Media Center Hotel і Hotel Nikko New Century Beijing. Па відэасувязі яны злучаны іх з прэс-залай у Доме народных сходаў. Менавіта адсюль самая актуальная інфармацыя разыходзіцца па ўсім свеце.



Чым жа адметны XX з'езд КПК, які на тыдзень стаў галоўным сусветным ньюсмейкерам?

### АД ПЕКІНА ДА МАРСА

Старшыня КНР, генеральны сакратар КПК Сі Цзіньпін у сваім выступленні на партыйным форуме акрэсліў мэты і задачы развіцця Кітая. Ён адзначыў, што здзейснены прарыў у асваенні шэрагу асноўных ключавых найноўшых тэхналогій, развіліся і ўмацаваліся галіны стратэгічнага значэння, паведаміла «Жэньмінь жыбаа» анлайн». «Былі адзначаны найважнейшыя дасягненні ў такіх галінах, як пілатаванае касмаплаванне, зандзіраванне Месяца і Марса, зандзіраванне зямных нетраў і глыбакаводнае марское зандзіраванне, суперкамп'ютары, спадарожнікавая навігацыя, квантавая інфарматыка, тэхналогіі ядзернай энергетыкі, вытворчасць вялікіх самалётаў, біямедыцына і біяфармацэўтыка, — падкрэсліў генеральны сакратар КПК.

З часу склікання XVIII з'езда партыі прайшло ўжо дзесяць гадоў. На працягу гэтага часу мы былі сведкамі трох найважнейшых падзей, якія маюць вялікае практычнае і глыбокае гістарычнае значэнне для справы партыі і народа, заўважыў Сі Цзіньпін. «Па-першае, мы сустрэлі стагоддзе Камуністычнай партыі Кітая; па-другое, сацыялізм з кітайскай спецыфікай уступіў у новую эпоху; па-трэцяе, мы выканалі гістарычную задачу інтэнсіўнай ліквідацыі беднасці і ўсебаковай пабудовы сяррэднезаможнага грамадства, рэалізаваўшы намечаную да стагоддзя КПК мэту», — адзначыў Сі Цзіньпін.

За мінулае дзесяцігоддзе Кітай здзейсніў гістарычны скачок у нарошчванні эканамічнай моцы, заявіў генеральны сакратар КПК. Агульны аб'ём валавога ўнутранага прадукту краіны павялічыўся з 54 да 114 трыльёнаў юаняў (прыкладна 16 трлн долараў ЗША). Доля сукупнага аб'ёму эканомікі Кітая ў сусветнай эканоміцы дасягнула 18,5 працэнта, прырост склаў 7,2 працэнтных пункта, па гэтым паказчыку краіна трывала заняла другое месца ў свеце, адзначыў Сі Цзіньпін. ВУП на душу насельніцтва ў Кітаі павялічыўся з 39,8 да 81 тысячы юаняў. Па агульным аб'ёме вытворчасці збожжавых КНР замацавалася на першым месцы ў свеце. Кітай нязменна лідзіруе ў свеце па маштабе апрацоўчай прамысловасці і аб'ёме валютных рэзерваў, падкрэсліў Сі Цзіньпін.

Пяць гадоў, якія прайшлі пасля папярэдняга з'езда КПК, былі надзвычай няпростымі. ЦК партыі, комплексна ўлічваючы агульную стратэгію вялікага адраджэння кітайскай нацыі і нябачаныя за апошнія сто гадоў каласальныя перамены ў свеце, выпрацаваў найважнейшыя стратэгічныя планы па развіцці справы партыі і дзяржавы, заявіў Сі Цзіньпін. Паводле слоў кітайскага лідара, у барацьбе з карупцыяй была здабыта пераважная перамога. Гэта ўдалося дзякуючы таму, што адначасова «білі і па тыграх, і па мухах», а таксама «палявалі на ліс», вобразна выказаўся ён. Аднак спыняцца на дасягнутым у Кітаі не збіраюцца. «Карупцыя — гэта самая вялікая ракавая пухліна, якая ставіць пад пагрозу жыццяздольнасць і баяздольнасць партыі», — заявіў кітайскі лідар і дадаў, што барацьба з гэтай праблемай будзе працягнута самымі жорсткімі і бязлітаснымі метадамі.

### УНІКАЛЬНАЯ МІСІЯ

Як заўважыў Сі Цзіньпін, наступная пяцігодка — «ключавы перыяд, які пакладзе пачатак усебаковаму будаўніцтву мадэрнізаванай сацыялістычнай дзяржавы». Партыя ставіць за мэту дасягнуць новых прарываў у развіцці эканомікі, значна павысіць незалежнасць і ўмацаваць уласны навукова-тэхнічны патэнцыял. Пры гэтым КПК не забываецца і пра культурны складнік, абяцаючы забяспечыць народу больш разнастайнае культурнае і духоўнае жыццё, а таксама надаць увагу ахове здароўя. На наступныя пяць гадоў запланаваны рэформы і мадэрнізацыя Народна-вызваленчай арміі Кітая. Як адзначыў Сі Цзіньпін, ператварэнне НВАК у адны з наймацнейшых узброеных сіл у свеце да 2027 года — прыярытэт для кіраўніцтва краіны.

Паводле яго слоў, Пекін працягне працаваць над уз'яднаннем з Тайванем. Улады КНР будуць імкнуцца дасягнуць названай мэты мірным шляхам. Пры гэтым Сі Цзіньпін падкрэсліў недапушчальнасць умяшання знешніх сіл ва ўнутраныя справы Кітая. Закранаючы міжнародную палітыку, Сі Цзіньпін звярнуў асаблівую ўвагу, што КНР не прымае мыслення часоў халоднай вайны, умяшання ва ўнутраныя справы іншых краін і выступае супраць двайных стандартаў. Кітай таксама выступае рашуча супраць любых форм гегемоніі і палітыкі грубай сілы, пратэкцыянізму, аднабаковасці і цкавання ў міжнародных адносінах. «Неабходна ўдасканальваць механізмы барацьбы з санкцыямі, умяшаннем звонку і экстэрытарыяльнай юрысдыкцыяй», — адзначыў кітайскі лідар. Кітайскія эксперты адзначаюць, што гэтая гегемонія і яе паслядоўнікі не прымаюць поспехі Кітая, паколькі гэта можа прывесці да краху сістэмы, якую яны пабудавалі, адзначыла выданне Global Times.

Сі Цзіньпін адзначыў важнасць мадэрнізацыі сістэмы і патэнцыялу нацыянальнай бяспекі. Ён заўважыў, што «гэта аснова нацыянальнага адраджэння, а сацыяльная стабільнасць — неабходная ўмова пабудовы моцнага і квітнеючага Кітая». Не менш важная і мадэрнізацыя эканомікі. У прыватнасці, прамысловая сістэма будзе развівацца з прыняццем мер па прасоўванні новай індустрыялізацыі і ўмацаванні патэнцыялу Кітая ў галіне вытворчасці, якасці прадукцыі, аэракасмічнай вобласці, транспарту, кіберпрасторы і лічбавага развіцця. Будзе ўдзелена ўвага развіццю і падтрымцы сельскай гаспадаркі, барацьбе з беднасцю, харчовай бяспецы. Як трапна заўважыў Сі Цзіньпін, «кубак рысу кітайцаў знаходзіцца ў іх уласных руках».

Мадэрнізацыя ў Паднябеснай будзе паспяховай у тым выпадку, калі па тым жа шляху якасная трансфармацыі пойдзе і ўвесь астатні свет. Фактычна гэта агульны росквіт для ўсіх. Сам кітайскі лідар назваў місію ўнікальнай, паколькі яна змяшчае элементы, агульныя для мадэрнізацыйных працэсаў усіх краін. Хоць, вядома, гэта найбольш унікальна менавіта для кітайскага кантэксту. Адным словам, наступныя пяць гадоў будуць мець выразна выразныя значэнне. І беспраблемнымі яны не будуць. «Мы павінны быць гатовымі да горшага сцэнарыя і супрацьстаяць моцнаму ветру, неспакойнай вадзе і нават небяспечным штормам», — адзначыў кітайскі лідар.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

У тэму

### Ключавая пяцігодка

З'езд з'яўляецца ключавой падзеяй у палітычным календары КНР. Першы адбыўся ў год заснавання КПК — у 1921-м, і тады партыя ўяўляла сабой толькі некалькі асобных гурткоў агульнай колькасцю крыху больш за паўсотню чалавек. Раней партыйныя форумы скліканіся з рознай перыядычнасцю, а з 1977-га замацавалася практыка праводзіць іх кожныя пяць гадоў.

XX з'езд завершыць работу сёння, за гэты час дэлегаты разгледзелі даклад ЦК КПК 19-га склікання, вывучылі даклад аб рабоце Цэнтральнай камісіі КПК па праверцы дысцыпліны, разгледзелі і ўхвалілі папраўкі да статута. Таксама былі абраныя ЦК і Цэнтральная камісія па праверцы дысцыпліны. Пасля закрыцця з'езда адбудзецца першы пленум ЦК 20-га склікання. На ім абяруць новы склад Палітбюро і яго Пастаяннага камітэта, а таксама генеральнага сакратара КПК.

Аб'ектыў

# БЛІСКУЧАЕ ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ

## У зале Перамогі адкрылася фотавыстава, якая знаёміць з дасягненнямі Кітая

**Фотавыстава «Бліскучае дзесяцігоддзе Кітая ў новую эпоху», якая адкрылася ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, знаёміць з гісторыяй дасягненняў КНР. Аб гэтым паведаміў падчас адкрыцця адметнай экспазіцыі ў зале Перамогі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН.**

Дыпламат звярнуў увагу, што гэтая выстава арганізавана ў гонар правядзення XX з'езда КПК прэс-канцылярыяй Дзяржсавета Кітайскай Народнай Рэспублікі і Пасольствам КНР у Рэспубліцы Беларусь. Кітай за апошняе дзесяцігоддзе ў сваёй эканамічнай, навукова-тэхнічнай і сукупнай моцы выйшаў на новы ўзровень. «У лістападзе 2012 года адбыўся XVIII з'езд КПК, пасля чаго новае кіраўніцтва ЦК КПК на чале са старшынёй Сі Цзіньпінам прыняло эстафету гісторыі, і сацыялізм з кітайскай спецыфікай уступіў у новую эпоху. Вялікае адраджэнне кітайскай нацыі ўступіла ў незваротны гістарычны працэс. Гэта было вялікае і бліскучае дзесяцігоддзе», — заўважыў Се Сяаюн.



«Моц вялікага Кітая — у згуртаванасці і адзінстве партыі, — перакананы





**намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый МІЦКЕВІЧ.** — Кітай паступальна рэалізоўвае мару аб вялікім адраджэнні кітайскай нацыі. Дзякуючы зладжанай працы партыі і ўрада, працавітаму і любячаму сваю Радзіму кітайскаму народу Кітайская Народная Рэспубліка дабілася значных поспехаў у справе пабудовы сацыялізму з кітайскай спецыфікай».

Валерый Міцкевіч назваў сімвалічным, што гэтая выстава праходзіць у зале Перамогі. «За апошняе дзесяцігоддзе Кітайская Народная Рэспубліка дабілася выдатных перамог ва ўмацаванні незалежнасці краіны, яе абараназдольнасці і сацыяльна-эканамічным развіцці. Сёння Кітай — вядучая эканоміка свету», — падкрэсліў віцэ-спікер.

Паводле яго слоў, высакародныя мэты XX з'езда КПК выклікаюць самы жывы водгук і цікавасць у Беларусі. «Мы шчыра радуемся дасягненням дружалюбнага Кітая. У прынятай у верасні кіраўнікамі нашых дзяржаў Сумеснай дэкларацыі аб устанаўленні адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства змяшчаюцца прарыўныя напрамкі гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, рэалізацыя якіх унясе важкі ўклад у павышэнне дабрабыту народаў дзвюх краін», — сказаў Валерый Міцкевіч.

Віцэ-спікер падкрэсліў, што адзінства поглядаў і агульныя каштоўнасці заклалі моцны падмурак стратэгічнага партнёрства нашых краін: «Мы з аптымізмам глядзім у будучыню і ўпэўнены, што міждзяржаўныя, міжпарламенцкія і прамыя адносіны паміж людзьмі будуць у далейшым пашырацца і ўмацоўвацца на карысць народаў Беларусі і Кітая».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | |
| Продавец | **ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150** | |
| **Предмет аукциона** | | |
| **Лот № 1** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21, 150/22, 150В, 150, 150/20 | | |
| **Наименование (назначение)** | **Инв. №** | **Общ. пл.** |
| **Здание заправочной склада ГСМ** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности:** железобетонный островок под топливозаправочными колонками, 3 резервуара, 15 емкостей, 2 емкости для эмульсий | 350/С-204136 | 35,5 кв. м |
| **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** площадка (мощение), подкрановые пути козлового крана (2 шт.), ограждение, ворота (2 шт.), склад | 350/С-204137 | 3 203,7 кв. м |
| **Склад лакокрасок, ГСМ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** пристройка | 350/С-210707 | 186 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,8037 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания открытого склада металла с участком лакокрасок и ГСМ | | |
| **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности:** бордюр | 350/С-209431 | 40 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0262 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| **Ангар участка нестандартного оборудования** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности**: ангар, площадка, три ограждения, ворота. | 350/С-206388 | 369,1 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4458 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания ангара участка нестандартного оборудования | | |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 1 034 582,40 бел. руб.** | | |
| **Лот № 2** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/2-1, 150 | | |
| **Производственное помещение** (производственное помещение). **Составные части и принадлежности:** пристройка (11 шт.), склад ОКСа, прессовый участок, навес, подкрановые пути, 2 автомобильные дороги, 2 ограждения | 350/D-298466 | 9 108,2 кв. м |
| **Магазин** (здание специализированное розничной торговли). **Составные части и принадлежности:** две пристройки, крыльцо | 350/С-74042 | 162 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 1,6127 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания ремонтно-механического цеха и здания специализированного розничной торговли | | |
| **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности:** автодорога, бордюр, ворота, ограждение | 350/С-209429 | 575 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0575 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности:** бордюр | 350/С-209430 | 187 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,1258 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов иного назначения | | |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 3 177 470,94 бел. руб.** | | |
| **Лот № 3** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/17, 150/16, 150 | | |
| **Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** (здание специализированное обрабатывающей промышленности). **Составные части и принадлежности:** пристройка, навес, здание подкачки и монтажа шин, помещение склада участка безрельсового транспорта, гараж, склад металла, ворота, калитка, 3 ограждения, канава для осмотра автомашин | 350/С-167815 | 837,1 кв. м |
| **Цех безрельсового транспорта** (здание специализированное транспорта) **Составные части и принадлежности:** 2 пристройки, площадка, 2 ограждения, 4 отстойника | 350/С-75350 | 569,8 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6481 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания специализированного транспорта, здания специализированного складов | | |
| **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности:** бордюр | 350/С-209428 | 93 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0864 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 822 495,37 бел. руб.** | | |
| **Лот № 4** **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150, 150/16, 150-1 | | |
| **Корпус опытно-промышленного производства сорбентов** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности:** крыльца | 350/С-107542 | 2311,3 кв. м |
| **Автостоянка № 2** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности:** 2 пристройки, площадка, 2 ограждения, 4 отстойника | 350/С-107541 | 1812 кв. м |
| **Зарядная станция** (здание специализированное иного назначения) | 350/С-56078 | 172 кв. м |
| **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4858 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания корпуса опытно-промышленного производства сорбентов с прилегающими боксами, зарядной станцией, автостоянкой | | |
| **Помещение транспортного назначения** (помещение транспортного назначения) | 350/D-182492 | 294,9 кв. м |
| **Начальная цена (с НДС 20 %) – 556 160,46 бел. руб.** | | |
| Шаг аукциона: 5 % от текущей цены. С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов: www.cpo.by | | |
| **Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | | |
| Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона | | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 08.09.2022 г. | | |
| Дата и время начала и окончания электронных торгов: **10.11.2022 с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов | | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 09.11.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** | |

**БЕЛАРУСБАНК**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – ОАО «АСБ Беларусбанк»

**Наименование объекта продажи –**

## КАПИТАЛЬНОЕ СТРОЕНИЕ (ГАРАЖ)

**общей площадью 46,0 кв. м, в г. Ганцевичи Брестской обл., по ул. Октябрьская, 8А.**

Начальная цена продажи – 1 860,00 руб. (одна тысяча восемьсот шестьдесят руб. 00 коп.) с учетом НДС – 20 %.

Сумма задатка – 190,00 руб. (сто девяносто руб. 00 коп.).

**Открытый аукцион состоится 08.12.2022 в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал (9-й этаж).**

Заявления на участие принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00, в пятницу – до 15.45 по 06.12.2022 включительно по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 (тел. (0162) 277518, МТС (8029) 7939576 Кулик Дмитрий Николаевич).

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается и регистрируется в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

По вопросам, связанным с организацией осмотра объекта продажи, обращаться по телефонам: (01646) 23939, А1 80291137265 моб. – Занько Денис Сергеевич.

*Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка по 06.12.2022 года включительно на счет № BY69AKBB66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Затраты по оформлению документов по сделке производятся за счет покупателя.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 40 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Многоквартирный жилой дом в районе дома 21 по ул. Логойской в г. Жодино»

**Информация о застройщике:**

Общество с дополнительной ответственностью «ИНГРАНТ» (ОДО «ИНГРАНТ»)

Юридический адрес: 220056, г. Минск, ул. Героев 120-й Дивизии, 3А, каб. 1, с 9.30 до 13.00, с 14.00 до 17.00, суббота–воскресенье выходной. По всем вопросам, касающимся долевого строительства, можно обращаться по адресу: г. Жодино, ул. Сухогрядская, д. 11, 4-й этаж, пом. 35, тел. +375 29 110 85 85 или на сайт logoysky.by.

**Государственная регистрация застройщика:** 08.05.2009 г. № 191116128, Мингорисполком.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ОДО «ИНГРАНТ» участие не принимало.

**Информация об объекте строительства**

**Цель строительства:** строительство объекта недвижимости «Многоквартирный жилой дом в районе дома 21 по ул. Логойской в г. Жодино» (далее – жилой дом).

**Этапы и сроки реализации строительства:** начало строительства – 27.07.2022 г., завершение строительства (ввод объекта в эксплуатацию) – 26.08.2023 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 2117-70/21 от 16 марта 2022 года, выдано РУП «Госстройэкспертиза по Минской области».

**Местонахождение строящегося жилого дома:** г. Жодино, район дома 21 по улице Логойской.

**Характеристика строящегося жилого дома:**

9-этажный, шестисекционный, 229-квартирный жилой дом в конструкциях серии М 464-У1М. Наружные стены – из сборных трехслойных железобетонных панелей толщиной 300 мм с эффективным утеплителем. Внутренние стены предусмотрены из железобетонных панелей толщиной 140 мм. Высота помещений жилого дома (от пола до потолка) – 2,54 м. Проектом предусмотрены техподполье, теплый технический чердак. Жилой дом оборудован 6 пассажирскими лифтами грузоподъемностью 1000 кг. Все квартиры имеют остекленные лоджии. Окна и элементы остекления лоджий – из профилей ПВХ. Для физически ослабленных лиц предусмотрен подъемник при входе во встроенное помещение. Система отопления запроектирована с установкой узла учета тепла для каждой квартиры. В проекте предусматривается индивидуальный учет холодной и горячей воды для каждой квартиры. Предусмотрен расчетный учет электроэнергии: для каждой квартиры – в этажных щитках. Все приборы объединены в систему автоматизированного учета (АСКУЭ).

Наружная отделка: стены – фактурное покрытие защитно-декоративным полимерным составом (ЗДПС), окраска фасадной краской. Источник теплоснабжения – наружные тепловые сети. Для телефонизации жилого дома проектом предусмотрен ввод магистрального волоконно-оптического кабеля.

Общее количество квартир – 229, в том числе 1-комнатных квартир – 86, 2-комнатных квартир – 120, 3-комнатных квартир – 23.

**Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства:** 70 единиц.

**Цены на объекты долевого строительства**

1-комнатные квартиры общей площадью от 42,80 м² до 51,99 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет 850 (восемьсот пятьдесят) долларов США;

2-комнатные квартиры общей площадью от 59,45 м² до 68,53 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет 850 (восемьсот пятьдесят) долларов США;

3-комнатные квартиры общей площадью от 76,26 до 92,31 м². Стоимость строительства 1 м² квартиры составляет 850 (восемьсот пятьдесят) долларов США.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа, условий оплаты строящегося жилого помещения, и иных факторов, влияющих на стоимость.

**Условия оплаты:** оплата цены объекта долевого строительства (цены договора) производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в Жодинском городском исполнительном комитете. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному НБ РБ на дату оплаты. Датой оплаты признается дата фактического зачисления денежных средств на счет Застройщика.

При рассрочке (50 % в течение 5 календарных дней после регистрации договора, остаток – по графику платежей) стоимость 1 м² увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 30 долларам США.

При привлечении кредита по партнерским программам банков стоимость 1 м² увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 50 долларам США.

**Права застройщика на земельный участок:** на праве аренды, общая площадь земельных участков 1,7372 га, назначение – для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирный жилой дом в районе дома 21 по ул. Логойской в г. Жодино». Свидетельство о государственной регистрации от 11.09.2018 г. № 612/640-12433.

**Границы земельного участка:** г. Жодино, район дома 21 по улице Логойской;

**Элементы благоустройства:** проектом предусмотрены полное благоустройство территории с организацией подъезда, тротуара для пешеходов, пешеходных дорожек. На прилегающей территории запроектированы: площадка для сбора бытовых отходов, места для парковки автомобилей, велопарковка, детская площадка, площадка для отдыха взрослых, площадка для занятий спортом.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находится в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:**

помещения инженерного назначения, межквартирные, лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома.

**Сведения о нежилых помещениях, не входящих в состав общего имущества:** Административно-офисное помещение общей площадью 36,62 м².

**Договор строительного подряда** № 25/07-2022 от 25.07.2022 г., заключен застройщиком с ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе продаж застройщика, расположенном по адресу: г. Жодино, ул. Сухогрядская, д. 11, 4-й этаж, пом. 35, тел. +375 29 110 85 85 или на сайте logoysky.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению открытого акционерного общества
«Озерицкий-Агро» (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе:**

• **склад гранулированных кормов** *(составные части и принадлежности: пандус, асфальтовое покрытие, подпорные стены, тамбур, люковый проем, кирпичное помещение, шахта, емкость)*, **инв. № 614/С-40357;**
• **здание для хранения сена МТФ «Слобода», инв. № 614/С-39908 общей площадью 644 кв. м;**
• **здание пожарного поста на 1 машину в районе МТФ «Слобода»** *(составные части и принадлежности: навес)*, **инв. № 614/С-40534 общей площадью 296,5 кв. м;**
• **здание блока служебных помещений МТФ «Слобода»** *(составные части и принадлежности: подвал, сход в подвал)*, **инв. № 614/С-40535 общей площадью 397,4 кв. м;**
• **здание коровника** *(составные части и принадлежности: 4 (четыре) навеса)*, **инв. № 614/С-40350 общей площадью 1906,5 кв. м;**
• **здание коровника, инв. № 614/С-40356 общей площадью 1424,2 кв. м;**
• **молочный блок, инв. № 614/С-40351 общей площадью 6,7 кв. м.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624800000001002451 площадью 5,0096 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, вблизи аг. Слобода, 4/2; 4/1; 4/7; 4; 4/3; 4/5; 4/7 соответственно.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,1233 га;*

• **ветпункт стационар и изолятор, инв. № 614/С-44472 общей площадью 300 кв. м;**
• **здание коровника** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 614/С-44474 общей площадью 5204,2 кв. м.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624883000018000076 площадью 3,4134 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, вблизи аг. Слобода, 4А/1; 4А соответственно.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей до 1000 вольт, пл. 0,0557 га;*

• **здание коровника** *(составные части и принадлежности: пристройка, крыльцо)*, **инв. № 614/С-40355 общей площадью 2109,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624800000001004527 площадью 0,7392 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, расположенный в близи аг. Слобода, 4/4.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей до 1000 вольт, пл. 0,0356 га; придорожная полоса автомобильных дорог, пл. 0,0024 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 2 235 759,06** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **223 575,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108 2600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **23.11.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.11.2022** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01776) 28-5-16, 8 (029) 347-22-75.**

УНП 690363881

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 22.11.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**
**Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 441/С-15090 (назначение – здание общежития, наименование – здание общежития), общей площадью 192,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 1 Мая, 48.<br>Лот № 1 находится на земельном участке кадастровый № 422950100001002683, площадью 0,1220 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания общежития), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 1 Мая, 48. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0025 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, код – 5.4, площадью 0,0050 г |
| **Начальная цена продажи** | 64 100 руб. (шестьдесят четыре тысячи сто рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 6 410 руб. (шесть тысяч четыреста десять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.<br>Последний день приема заявлений – **18 ноября 2022 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |


**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




Мужчынскі духоўны ордэн езуітаў Рымска-каталіцкай царквы прыцягваў да веры праз навуку і адукацыю. Дзеля гэтых мэтаў па ўсім свеце будаваў навучальныя ўстановы — езуіцкія калегіумы. Такі калегіум у 1580 годзе з дазволу караля польскага і вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя быў заснаваны і ў Полацку. У 1812 годзе указам імператара Аляксандра I ён быў пераўтвораны ў Полацкую езуіцкую акадэмію з правамі ўніверсітэта. У 1820 годзе езуіты, якія не пажадалі зняць з сябе ордэнскія абяцанні, былі высланы з Расійскай імперыі, а Полацкая акадэмія была ліквідавана. У будынках калегіума пасля доўга размяшчаўся Полацкі кадэцкі корпус, у гады савецкай улады яго памяшканні выкарыстоўваліся для гаспадарчых патрэб, у адным з будынкаў размяшчалася мастацкая галерэя, у самым вялікім да 1993 года — ваенны шпіталь. Найноўшая гісторыя калегіума пачалася з заснавання ў 1958 годзе горада Наваполацка. У ім савецкая ўлада вырашыла размясціць вытворчыя комплексы нафтаперапрацоўчай і хімічнай прамысловасці. Для развіцця гэтых заводаў патрабаваліся кадры, у тым ліку інжынерныя. У маладым горадзе быў адчынены філіял Беларускага політэхнічнага інстытута, пасля — філіял Беларускага тэхналагічнага інстытута, і вось Полацку ізноў пашчасціла — сюды прыйшоў працаваць выкладчыкам Эрнст Міхайлавіч Бабенка. Ён скончыў Маскоўскі хіміка-тэхналагічны інстытут імя Д. І. Мендзялеева, пасля працаваў у НДІ электроднай прамысловасці ў Чалябінску, пасля гэтага нейкі час выкладаў у Полацку, затым ізноў працаваў у Расіі, але ўжо на кіруючых пасадах, і, нарэшце, канчаткова асеў у Наваполацку. Вось ён і стварыў на базе філіялаў мінскіх ВНУ Наваполацкі політэхнічны інстытут, якія пасля пашырыў да Полацкага ўніверсітэта.

Пра рэктара Бабенку ў Беларусі загаварылі. Доктар тэхнічных навук, прафесар, аўтарытэтны вучоны і энергічны кіраўнік — у рэктарскім корпусе ён стаў прыкметным. Багатая нафтавая галіна, для якой інстытут рыхтаваў кадры, расійскія сувязі і знаёмствы рэктара Бабенкі, яго націск і дальнабачнасць дапамаглі маладой наваполацкай ВНУ за кароткія тэрміны стварыць сучасную вучэбную базу, сфарміраваць годны прафесарска-выкладчыцкі склад і тым самым забяспечыць прывабнасць для маладых людзей. Развіваючы ідэю прадаўжэння сярэднявечных адукацыйных традыцый на полацкай зямлі, Эрнст Міхайлавіч стаў дамагацца перадачы ўніверсітэту ўсіх будынкаў езуіцкага калегіума. Яны былі, безумоўна, далёкія да прыстасаванасці для вучэбнага працэсу, некаторыя ўвогуле доўгі час не эксплуатаваліся, у адзін з іх у гады Вялікай Айчыннай вайны патрапіла бомба, і з таго часу там стаялі толькі сцены — рэктар настойваў на сваім. Усе рэктары ведаюць, наколькі складанымі з'яўляюцца пытанні перадачы маёмасці, ведаў гэта і прафесар Бабенка, але паслядоўна, некалькі гадоў ішоў да гэтай мэты. Рашэннем Прэзідэнта старадаўнія будынкі ўніверсітэт атрымаў, і ў іх сценах пачыналася новая гісторыя.

Я быў начуты пра рэктара Полацкага ўніверсітэта яшчэ прарэктарам. Назіраў з боку напружанасць паміж кіраўніцтвам Віцебскага і Полацкага ўніверсітэтаў па пытаннях адкрыцця педагагічных спецыяльнасцяў — ці трэба і там, і там рыхтаваць настаўнікаў гісторыі ці філалогіі? На нарадах у міністэрстве знаходзіў вачыма Эрнста Міхайлавіча, бачыў, як годна ён сябе паводзіць з калегамі і кіраўніцтвам міністэрства, але нагоды падысці да яго, прадставіцца, пагаварыць не здаралася. Можа быць, ён сам адчуў маё жаданне бліжэй з ім пазнаёміцца, і нечакана ў 2002 годзе я атрымаў ад яго запрашэнне на 65-гадовы юбілей. Ён тады запрасіў з Магілёва двух рэктараў — мяне і майго сябра Ігара Сазонава. Вось з таго часу ў мяне з Эрнстам Міхайлавічам і ўсталяваліся сяброўскія адносіны. Нават калі па ўзросце ён сышоў з пасады рэктара, пры наведванні Полацкага ўніверсітэта я яго заўсёды знаходзіў. Будынкі калегіума ён жа для ўніверсітэта набыў, і іх трэба было рэстаўраваць!

Мяркую, што прызначэнне рэктарам Полацкага ўніверсітэта пасля прафесара Бабенкі Дзмітрыя Мікалаевіча Лазоўскага было і відавочна, і няяўна прадвызначана гісторыяй таго самага езуіцкага калегіума. Лазоўскі скончыў Полацкі, тады яшчэ політэхнічны інстытут, затым аспірантуру ў Маскоўскім НДІ жалезабетону, абараніў кандыдацкую, а пасля і доктарскую дысертацыю, як ён мне сам казаў, па будаўнічых фундаментах. Дзмітрый Мікалаевіч — рэктар майго пакалення, сур'ёзны вучоны, аўтарытэтны кіраўнік, разумны суразмоўнік — мы з ім пасябравалі яшчэ рэктарамі. Мне заўсёды цікавымі падаваліся тэмы навуковых вышукаў маіх калег, іх аповеды пра гэты бок жыцця былі захапляльнымі, упрыгожвалі нашы службовыя і асабістыя адносіны. Напрыклад, прафесар Лазоўскі прымаў удзел у праектаванні фундаментаў арыгінальнага па архітэктуры і будаўнічых канструкцыях будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Ён расказваў, што ім давялося вылічваць двухметровыя залежы торфу на шасцідзесяціметровай глыбіні. Я шчыра здзівіўся — сам жа вырас на торфапрадпрыемстве, увачавідкі бачыў, што торф быў заўсёды на паверхні, адкуль ён на такой глыбіні пад Мінскам? Дзмітрый Мікалаевіч растлумачыў:

— Пасля ледніковага перыяду!

Я не разумею:

— А пры чым тут ляднік?

— А вось скажыце, якой таўшчыні мог быць лёд над Мінскам у той час?

— Метраў сто...

— Да трох кіламетраў! Ляднік пры сваім руху змяняў рэльеф! Сціраў горы і ўзвышанасці, змяняў рэчышчы рэк. Уся зямля на тэрыторыі Беларусі прынесеная. Ёсць толькі два выйсці на паверхню рэліктавых парод — пад Шкловам і ў раёне Ракава. Торф на такой глыбіні — гэта тое, што засталося ад даледніковых лясоў.

Пры будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі пры рашэнні яшчэ адной праблемы запатрабаваліся вучоныя Полацкага ўніверсітэта. Велізарны будынак кнігасховішча ў выглядзе шматкутніка па праекце павінен быў мець поўнае вонкавае шкленне. Шкло арыгінальнае, вялікае, цяжкае — для ўсталявання рабілі спецыяльную ажурную металічную канструкцыю. Работа па яе ўстаноўцы патрабавала велізарнейшай дакладнасці, для дасягнення якой загадзя былі прадугледжаны восем рэперных кропак па перыметры бібліятэкі. Але ў працэсе будаўнічых работ іх проста згубілі. Засталіся каардынаты толькі адной. Работы маглі б надоўга спыніцца, будаўнікі ўзнавіць страчаныя рэперы былі не ў стане. Прэм'ер-міністр С. С. Сідорскі запатрабаваў ад мяне вырашыць гэту задачу з вучонымі БНТУ. Але яны не змаглі «падняць» задачу. Прэм'ер разгневаўся не на жарт! І я вырашыў праз рэктара Лазоўскага звярнуцца да вучоных яго ўніверсітэта. Ён мне неяк расказваў, што ў яго выдатная навуковая школа геадэзістаў на чале з прафесарам Уладзімірам Паўлавічам Падшывалавым. І яны справіліся з гэтай задачай!

Рэктар Лазоўскі вырашыў аднавіць усе будынкі калегіума. Адзін з іх быў прыведзены ў належны выгляд яшчэ пры Бабенку. Новы рэктар завяршыў там усе рамонтныя работы і запрасіў мяне паглядзець гэты вучэбны корпус універсітэта ў Полацку, каб на месцы абмеркаваць планы далейшых работ і іх фінансаванне. Мы з ім няспешна пайшлі па старадаўняму будынку. Дзмітрый Мікалаевіч расказваў, для чаго спярша былі задуманы яго памяшканні, паказаў лесвіцу, якая захавалася ў першастворамным выглядзе, тую лесвіцу, па якой хадзіла Кацярына II, шмат якіх цудам ацалелых з тых часін артэфактаў. А я глядзеў яшчэ і на тое, як у гэтую даўніну рэктар упісаў патрабаванні і культуру сучаснага ўніверсітэта. Упісаў! І зрабіў гэта з густам. Прафесар Лазоўскі ўвогуле вылучаўся цягай да еўрапейскага стылю адукацыі, дэталёва вывучаў арганізацыю вучэбнага працэсу ў заходніх універсітэтах, быў прыхільнікам уваходжання Беларусі ў Балонскі працэс. І ў яго ўніверсітэце я гэта адчуў, нават убачыў — у вучэбным корпусе былі невялікія рэкрэацыі, утульныя закуткі, дзе стаялі невялікія столікі і крэслы, вазоны з пакаёвымі раслінамі і... паўсюль быў чуцен пах добрай кавы. У Наваполацку былі і карпусы ўніверсітэта, пабудаваныя ў савецкі час, — з вялікімі вокнамі, прасторнымі калідорамі, таксама па-свойму прыгожыя і прыдатныя для вучэбных заняткаў, але ў іх цяжка было дасягнуць той утульнасці, як у будынку былога езуіцкага калегіума.

Пра планы мы з рэктарам дамовіліся. Астатнія будынкі будзем аднаўляць паслядоўна, фінансаванне гэтага праекта ўніверсітэт па магчымасці падтрымае сваімі пазабюджэтнымі сродкамі і задзейнічае на будоўлі студэнтаў. Пра ход рэстаўрацыйных работ рэктар дакладваў у міністэрстве рэгулярна. Ніякіх збояў, пераносаў тэрмінаў будаўніцтва не дапускаў. Усе работы былі завершаны да 1150-годдзя Полацка, і мы запрасілі наведаць універсітэт у гэтыя дні Прэзідэнта.

Аляксандр Рыгоравіч таксама няспешна пайшоў па старадаўняму будынку былога езуіцкага каледжа. Ва ўсіх аўдыторыях праходзілі заняткі, чытальная зала была запоўнена студэнтамі, у актавай зале ішла рэпетыцыя святочнага канцэрта. Рэктар даваў Прэзідэнту тлумачэнні:

— Пры рэстаўрацыйных работах мы выкарыстоўвалі сучасныя матэрыялы. Вытворчасць цэглы тых часоў на дзіва дарагая, і ўсё адно яе з сапраўднай дакладнасцю ўжо не зробіш. Але там, дзе кладка захавалася, мы яе пакідалі, і нават дзе-нідзе плямамі на сценах паказваем. А вось гэтыя зводы ў чытальнай зале па знешнім выглядзе такія самыя, як і арыгінальныя, але з гіпсакартону.

Аляксандр Рыгоравіч строга пытаецца:

— Дык ты што, людзей падманваеш?

Рэктар тонка адчувае пытанне Прэзідэнта, шэптам яму гаворыць:

— Дык яны ж гэтага не ведаюць!

— Ты правільна ўсё робіш! Усё, што адрэстаўрыравана, на што патрачаны немалыя сродкі, у цябе працуе! Паўсюль займаюцца студэнты, усе памяшканні задзейнічаны пад вучэбныя кабінеты, чытальныя залы, лекцыйныя аўдыторыі. А то патрацім неймаверныя сродкі для дасягнення «гістарычнай дакладнасці», а пасля нават не глядзім на яе.

Рэктар паказаў Прэзідэнту і старадаўні гадзіннік над уваходам, і нават калодзеж з сярэднявечча. І ўсё тут функцыянавала! Усе будынкі і збудаванні езуіцкага калегіума набылі другое жыццё, ды яшчэ па сапраўдным прызначэнні — для адукацыі, праўда, ужо свецкай.

Рэктару Полацкага ўніверсітэта прапаноўвалі пасля мяне ўзначаліць Міністэрства адукацыі. Адмовіўся... «Прыкіпеў» да свайго ўніверсітэта. Працаваў рэктарам да 2021 года.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8,15 кастрычніка.)*

*(Працяг будзе 29 кастрычніка.)*

Размова па сутнасці

# НАВЫКІ ЧАТЫРОХ «К»

## Як выхаваць асобу выяўленчым мастацтвам?

**Сёлета Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А. К. Глебава святкуе сваё 75-годдзе. За гады свайго існавання ён набыў статус адной з вядучых устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне. Што да святкавання ўрачыстай даты, то яе ў каледжы адзначаюць на працягу года. А фінальным штрыхом стане вялікі канцэрт у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі 2 снежня. У ім прымуць удзел прадстаўнікі Вялікага тэатра оперы і балета, Акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры, а таксама каледжаў. Як ажыццяўляецца сёння дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі, па якіх напрамках вядзецца прафарыентацыя і папулярызацыя выяўленчага мастацтва ў Беларусі, спецыялісты культурнай сферы нядаўна абмяркоўвалі ў коле выкладчыкаў і аднадумцаў.**

Сярод самых вядомых выпускнікоў каледжа можна назваць Міхаіла Савіцкага, Мая Данцыга, Віктара Грамыку, Івана Міско, Васіля Шаранговіча і многіх іншых. У розныя гады выкладчыкамі навучальнай установы былі заслужаныя дзеячы мастацтваў Леў Лейтман, Андрэй Бембель, Натан Воранаў, Альгерд Малішэўскі, Оскар Марыкс, Віталь Цвірка. Месцам прыцягнення для таленавітых дзяцей застаецца «Глебаўка» і да сёння.

### «Студэнты, якія патрэбныя нам, абсалютна спецыфічныя»

— Нам неаднаразова прапаноўвалі паўдзельнічаць у нейкіх мерапрыемствах, звязаных з прафарыентацыяй. Аднак, паспрабаваўшы нават рэпрэзентаваць сябе на гарадскіх кірмашах вакансій, мы пастунова адмовіліся ад гэтага, таму што студэнты, якія патрэбны нам, абсалютна спецыфічныя, і з імі трэба працаваць і размаўляць зусім не так, як, скажам, з вучнямі 8-9 класаў агульнаадукацыйнай школы, — дзеліцца **дырэктар Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава Аляксандр ШАНТАРОВІЧ.** — Тым больш па тэндэнцыі апошніх гадоў бачым, што да нас прыходзіць больш ахвотных, чым мы можам узяць. Калі на заяўленыя 60 месцаў мы атрымліваем 250 заявак, то гэта нават не супадзе з нашымі магчымасцямі па арганізацыі ўступнай кампаніі — што датычыцца наяўнасці планшэтаў, мальбертаў, табурэтак. Сярэдні конкурс сёлета ў нас быў 7-8 чалавек на месца (кажу пра ўсе спецыяльнасці). Спецыялізацыя «Дызайн» б'е рэкорды па колькасці заявак — там сёлета конкурс быў 13 чалавек (18 чалавек летась) на месца.

Разам з тым кіраўнік навучальнай установы звярнуў увагу на некаторыя нюансы ўступнай кампаніі. Так, напрыклад, усё яшчэ сустракаюцца сярод будучых навучэнцаў дзеці, якія маюць не зусім яснае ўяўленне аб тым, куды яны ідуць. Хочуць, каб было, як у сюжэтах замежных фільмаў: герой успамінае, што марыў быць мастаком, а праз некалькі дзён вось вам ужо і персанальная выстаўка, поспех... Не разумеюць, што для такога выніку патрэбна вялікая і карпатлівая праца. Аднак радуе выкладчыкаў сёння ўжо тое, што знікла такая ўстаноўка бацькоў: калі дзіця не мае здольнасцяў да дакладных навук, то можна аддаць яго ў творчасць. Хоць раней, гадоў пяць таму, такі пасыл яшчэ можна было назіраць. І апошнім часам паступаць у «Глебаўку» ўсё часцей прыходзяць навучэнцы з высокім сярэднім балам.

— Зараз абмяркоўваецца пытанне агульнаадукацыйнага кампанента, у тым ліку і для ўстаноў культуры. І я думаю, тое, што прапаноўваецца сёння стандартным для ўсіх каледжаў, нам не падыходзіць. Я, напрыклад, выкладаю ў нашай установе матэматыку, але 240 гадзін гэтай дысцыпліны нам не патрэбна. У той час як па 80 гадзін на рускую і беларускую літаратуру — гэта ўвогуле нішто, — кажа Аляксандр Валер'евіч. — Няма такой галіны ведаў, дзе мог бы сабе хоць крыху не разбірацца мастак. Як і няма тэм, на якія б не мог пісаць творчы чалавек. Мы павінны навучыць нашых студэнтаў лагічна мысліць, развіваць іх апарат аналізу і сінтэзу. І ў гэтым дапамагае не толькі матэматыка, але і вялікі пласт літаратуры.

### Практыканты — на пленэр

У працяг размовы выказаліся па тэме прафесійнай арыентацыі і папулярызацыі выяўленчага мастацтва сярод моладзі таксама і прадстаўнікі сталічных мастацкіх школ, цэнтра дадатковай адукацыі і іншых навучальных устаноў. Так, **сацыяльны педагог Беларускага дзяржаўнага каледжа імя А. К. Глебава Юлія СЯРГЕЕВА** распавяла, што для таго, каб мець поспыт сярод будучых абітурыентаў, іх калектывам праводзіцца вялікая работа па прафарыентацыі. Тут і майстар-класы, і дні адкрытых дзвярэй, а яшчэ выстаўкі-прэзентацыі і пленэры.

— Мы імкнёмся задзейнічаць усе магчымыя формы работы з дзецьмі. Падключаем да гэтага працэсу СМІ, бацькоў і ўсіх зацікаўленых людзей. Тыя ж майстар-класы праводзім у час канікул, што дае магчымасць наведаць іх як мінчанам, так і іншагароднім дзецям. Праходзяць заняткі ў фармаце рэпетыцыйнага экзамену, трапіўшы на яго, можна паказаць выкладчыкам свае работы, параіцца, як можна зрабіць іх лепшымі. Таксама на майстар-класах дапамагаюць нашы студэнты, што таксама спрацоўвае ў плюс, паколькі так дзецям лягчэй раскрыцца і гаварыць пра тое, што цікавіць, — кажа Юлія Аляксандраўна. — І ў інтэрнэце ў нас добра пабудавана работа ў гэтым кірунку. На сайце ці на нашым YouTube-канале можна знайсці відэа з адказамі на пытанні. Вельмі спрыяе папулярызацыі каледжа і прафарыентацыі тое, што з трэцяга курса ў студэнтаў пачынаецца практыка. У рамках яе ёсць магчымасць знаёміць дзяцей у мастацкіх школах з нашай навучальнай установай. На пленэры стараемся выязджаць у розныя гарады. І сёлета, у Год гістарычнай памяці, мы максімальна імкнуліся пашырыць геаграфію. А па выніках пленэраў ладзім выстаўкі, куды запрашаем людзей, што таксама працуе на прафарыентацыю.

### Колькі павінна доўжыцца мастацкая адукацыя?

Аднак адна справа гаварыць пра дзяцей, якія мэтанакіравана выбіраюць навучанне ў той альбо іншай установе, студыі, а зусім іншая, калі гэта вывучэнне мастацтва ў агульнаадукацыйнай школе. Там, як адзначыла **метадыст аддзела метадычнага забеспячэння гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Вольга ПІШЧЫК,** вельмі часта пасля дзевяці класаў мастацка-эстэтычнае выхаванне дзяцей заканчваецца. Пры гэтым, на думку спецыяліста, застаецца недаацэненым патэнцыял выяўленчага мастацтва. Бо з яго дапамогай можна ў кожнага дзіцяці фарміраваць вельмі важныя навыкі «чатырох «К» (камунікацыі, кааперацыі, крэатыўнага і крытычнага мыслення). І для гэтага патрабуецца наяўнасць добрых вучэбных матэрыялаў, добра падрыхтаваныя кадры і правільна арганізаваны адукацыйны працэс. Паколькі праз вывучэнне выяўленчага мастацтва ідзе фарміраванне асобы. Таму надзвычай важна ўдзяляць увагу кожнаму дзіцяці, і ўжо з першага класа весці іх па гэтым шляху...

Імкнуцца актыўна працаваць у кірунку прафарыентацыі і папулярызацыі заняткаў выяўленчым мастацтвам і мастацкія школы сталіцы. Ёсць свайго кшталту сімбіёз паміж імі і «Глебаўкай», бо дзеці, гледзячы на тых жа студэнтаў каледжа, імкнуцца туды паступіць, а на выхадзе кожная ўстанова атрымлівае творчых спецыялістаў і выкладчыкаў для сябе. І калі школы мастацтваў — адна з прыступак, якая дазваляе па-сапраўднаму таленавітым дзецям добра рыхтавацца да паступлення ў іншыя профільныя навучальныя ўстановы і самаўдасканальвацца, то разнастайныя выставачныя праекты, конкурсы — гэта магчымасць зірнуць на сябе ў кантэксце тых, хто побач стварае мастацтва, звярнуць на сябе ўвагу і, можа, нават атрымаць падтрымку для далейшага развіцця і самаўдасканалення. Так, напрыклад, з 14 да 19 лістапада 2022 года на базе каледжа пройдзе XIII Рэспубліканскі адкрыты мастацкі конкурс імя М. А. Савіцкага. Дадзенае творчае спаборніцтва адзінае ў нашай краіне дазваляе заяўляцца ў якасці лаўрэата на стыпендыю Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Шкада толькі, што праходзіць яно раз на тры гады. Гэта змяншае шанцы таленавітых маладых людзей.

### Таленту патрэбна падтрымка

— Што датычыцца дзяржаўнай падтрымкі, то ўсе мы ведаем пра існаванне спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Аднак, калі мы гаворым, у прыватнасці, пра мастакоў, то гэта і мой боль. Паколькі ў тых жа дзяцей, якія займаюцца музыкай, шанцы атрымаць спецыяльную стыпендыю большыя, бо конкурсаў больш. І, можа, варта было б ладзіць конкурсы і для таленавітых дзяцей больш юнага ўзросту, каб і яны маглі выходзіць на падтрымку фонду, — дзеліцца **намеснік старшыні экспертна-мастацкай камісіі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, начальнік аддзела адукацыйных праектаў і сувязяў з грамадскасцю Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Вольга МАСАЛАВА.** — Не менш важны складнік для павышэння матывацыі навучэнцаў — і адукацыя іх выкладчыкаў. Але не так шмат у нас сёння ахвотных павышаць кваліфікацыю.

Радуе ўсё ж і верыцца, што ў нашай краіне шмат апантаных сваёй справай выкладчыкаў, бо ў творчасці немагчыма інакш. Запаліць вочы дзяцей любоўю да мастацтва і спрыяць раскрыццю іх патэнцыялу магчыма пры ўмове, што такі агонь ужо ёсць у вас. Таму тыя, хто жадае самаўдасканальвацца, шукаюць новыя формы і падыходы ў арганізацыі навучальнага працэсу. У прыватнасці, у «Глебаўцы» думаюць, як запазычыць вопыт пермскіх калег, дзе кожны навучальны год распачынаецца нестандартна 25 жніўня. Студэнты і дзеці, якія толькі што паступілі, адпраўляюцца на двухтыднёвы пленэр, і там працуюць на прыродзе і ў атмасферы творчага пошуку. Прысутныя на сустрэчы змаглі адчуць такую атмасферу на выстаўцы маладых выкладчыкаў каледжа.

**Алена ДРАПКО.**


УТВЕРЖДЕНО
Приказом Директора
ООО «Лизинговая Компания «Евротайм»
06.10.2022 № 38

**ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ**

в Правила лизинга для физических лиц (за исключением индивидуальных предпринимателей) ООО «Лизинговая Компания «Евротайм» (утв. Приказом директора ООО «Лизинговая Компания «Евротайм» 28.04.2021 № 12)

1. Изложить подпункт 3.3.4. пункта 3.3. Правил в следующей редакции:

«3.3.4. использовать Предмет лизинга в качестве предмета залога в целях обеспечения исполнения своих обязательств как по кредитам и (или) займам (в том числе займам, оформленным векселями или облигациями), привлеченным Лизингодателем для оплаты стоимости Предмета лизинга, до и после передачи в лизинг Предмета лизинга, так и по иным привлекаемым Лизингодателем кредитам и (или) займам, в том числе по договорам факторинга. Лизингополучатель признается уведомленным об этом и соглашается с передачей Предмета лизинга в качестве предмета залога, как описано в настоящем подпункте 3.3.4 пункта 3.3 Правил, в момент подписания Договора в отношении соответствующего Предмета лизинга.».

2. Дополнить пункт 3.3. Правил подпунктом 3.3.6. следующего содержания:

«3.3.6. использовать Предмет лизинга в качестве предмета залога в целях обеспечения исполнения своих обязательств по договорам о выдаче банковской гарантии, заключаемым Лизингодателем. Лизингополучатель признается уведомленным об этом и соглашается с передачей Предмета лизинга в качестве предмета залога, как описано в настоящем подпункте 3.3.6 пункта 3.3 Правил, в момент подписания Договора в отношении соответствующего Предмета лизинга.».

УНП 193395412



УТВЕРЖДЕНО
Приказом Директора
ООО «Лизинговая Компания «Евротайм»
06.10.2022 № 37

**ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ**

в Правила № 1 ЮЛ-ТС лизинга для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей ООО «Лизинговая Компания «Евротайм» (утв. Приказом директора ООО «Лизинговая Компания «Евротайм» 08.04.2020 № 2)

1. Изложить подпункт 3.3.4. пункта 3.3. Правил в следующей редакции:

«3.3.4. использовать Предмет лизинга в качестве предмета залога в целях обеспечения исполнения своих обязательств как по кредитам и (или) займам (в том числе займам, оформленным векселями или облигациями), привлеченным Лизингодателем для оплаты стоимости Предмета лизинга, до и после передачи в лизинг Предмета лизинга, так и по иным привлекаемым Лизингодателем кредитам и (или) займам, в том числе по договорам факторинга. Лизингополучатель признается уведомленным об этом и соглашается с передачей Предмета лизинга в качестве предмета залога, как описано в настоящем подпункте 3.3.4 пункта 3.3 Правил, в момент подписания Договора в отношении соответствующего Предмета лизинга.».

2. Дополнить пункт 3.3. Правил подпунктом 3.3.5. следующего содержания:

«3.3.5. использовать Предмет лизинга в качестве предмета залога в целях обеспечения исполнения своих обязательств по договорам о выдаче банковской гарантии, заключаемым Лизингодателем. Лизингополучатель признается уведомленным об этом и соглашается с передачей Предмета лизинга в качестве предмета залога, как описано в настоящем подпункте 3.3.5 пункта 3.3 Правил, в момент подписания Договора в отношении соответствующего Предмета лизинга.».

УНП 193395412



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу.**

**Аукцион состоится 10.11.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 400/С-84111 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 143,2 кв. м, Гродненский р-н, Сопоцкинский с/с, д. Шинковцы, 21А. Лот № 2 находится на земельном участке, кадастровый № 422076216601000031, площадью 0,0936 га (назначение – земельный участок для для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Сопоцкинский с/с, д. Шинковцы, 21А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код 4.1, площадью 0,0936 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13.2, площадью 0,0014 га |
| **Начальная цена продажи** | 6 172,70 руб. (шесть тысяч сто семьдесят два рубля семьдесят копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 618 руб. (шестьсот восемнадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **08.11.2022 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.09.2021 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |





*Гэтымі днямі наш калега Анатоль КЛЯШЧУК адзначае юбілей. Вядомага беларускага фотамайстра ведаюць не толькі чытачы «Звязды», у якой ён працуе ўжо тры дзесяцігоддзі. Адметны прафесійны почырк, а яшчэ шчырая зацікаўленасць і павага да людзей і мясцін, якія трапляюць у аб'ектыў, робяць яго работы пазнавальнымі сярод дзясяткаў іншых. Можа, менавіта таму на яго фотаздымках людзі такія шчырыя, а пейзажы такія прыгожыя?*

*Мы ад душы віншуем Анатоля Віктаравіча і жадаем яму здароўя і натхнення! І, вядома ж, разам з чытачамі чакаем новых здымкаў!*

**Звяздоўцы.**



# У АБ'ЕКТЫВЕ — ЖЫЦЦЁ









## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Ритм» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Олейника П.С. извещает о проведении 24 ноября 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

<table>
<tr><th>№ лота</th><th>Наименование предметов торгов</th><th>Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.</th><th>Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.</th><th>Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.</th></tr>
<tr><td colspan="5">Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Для лота № 1 расходы по изготовлению технического паспорта, оформлению долей земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на Покупателя. 2.1) После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя, в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию долей от неделимого земельного участка с кадастровым номером 324550100001001774 площадью 6,7871 га, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, выделению долей земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на Покупателя. Доли земельного участка под объекты продажи (лоты № № 1–8) будут выделены, согласно законодательству РБ. 3. В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %.<br>Лоты № № 1–8 расположены на земельном участке с кадастровым номером 324550100001001774 площадью 6,7871 га, предоставленном ОАО «Ритм» на праве аренды (доля в праве 77/100). Целевое назначение земельного участка: содержание и обслуживание производственной базы. Адрес (местоположение): Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Светлогорское шоссе, 1.<br>Местонахождение лотов № № 1, 4–8: г. Речица, ул. Светлогорское шоссе, 1</td></tr>
<tr><td>1</td><td>Капитальное строение общей площадью 14 230,00 кв. м, наименование – корпус № 1, назначение: здание неустановленного назначения, инв. № 5731. В состав лота входят: ворота металлические, инв. № 6657\5; ограждение железобетонное, инв. № 6657,472 м; сети связи, инв. № 1090; автодороги промплощадки, инв. № 150, 10 м; тротуары, инв. № 1098, 350 кв. м; насос 2 ЭЦВ-10-63; насос СД 160\45; многолетние зеленые насаждения: инв. № 1099 – туя 4 шт., многолетние зеленые насаждения: инв. № 1099\е ель, 10 шт.; многолетние зеленые насаждения, инв. № 1099\м можжевельник – 27 кустов; автодороги и площадки, инв. № 1091 дл. 653 м; наружные сети освещения промплощадки, инв. № 3213; наружные сети технического водозабора, инв. № 151; наружные сети ВИК на промплощадке, инв. № 156; наружные сети ВИК на промплощадке, инв. № 3221; сети связи на промплощадке, инв. № 159; сети связи на промплощадке, инв. № 3216; сети ливневой канализации вне площадки, инв. № 1097; внешние сети связи к ПГРП-2, инв. № 3222</td><td>1 116 116,84</td><td>55 805,84</td><td>111 611,68</td></tr>
<tr><td>2</td><td>Капитальное строение с инв. № 340/С-3202239 общей площадью 1 095,1 кв. м, наименование – модуль Кисловодск, цех РМУ, назначение – здание неустановленного назначения, инв. № 6777. В состав лота входят: ворота металлические, инв. № 6657\1; пресс автомат 4 ГЖ; кран-укосина (г\п 0.5тн); станок фрезерный инструментальный широкоуниверсальный 6720В; копировально-фрезерный станок 6Г463 № 1; копировально-фрезерный станок 6Г463 № 2; тротуары, инв. № 1098, 50 кв. м; многолетние зеленые насаждения:, инв. № 1099\я, яблоня, 1 шт.; многолетние зеленые насаждения, инв. № 1099\т, туя, 4 шт. Местонахождение: г. Речица, ул. Светлогорское шоссе, 1/13</td><td>112 032,00</td><td>5 601,60</td><td>11 203,20</td></tr>
<tr><td>3</td><td>Капитальное строение с инв. № 340/С-3202238 общей площадью 101,3 кв. м, наименование – склад масел, назначение – здание специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 9506. Ограждение железобетонное, инв. № 6657, 50м. Тротуары, инв. № 1098, 50 кв. м. Местонахождение: г. Речица, ул. Светлогорское шоссе, 1/10</td><td>16 892,25</td><td>844,61</td><td>1 689,23</td></tr>
<tr><td>4</td><td>Капитальное строение общей площадью 52,6 кв. м, наименование – хозяйственно-бытовое здание, назначение – здание неустановленного назначения, инв. № 6657. Капитальное сооружение – стелла, площадью 0,7 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Речица ул. Светлогорское шоссе, в районе автостоянки на въезде в город, инв. № 37. Ограждение железобетонное, инв. № 6657, 21 м</td><td>9 587,19</td><td>479,36</td><td>958,72</td></tr>
<tr><td>5</td><td>Капитальное строение общей площадью 7,9 кв. м, наименование – КПП № 2, назначение – здание неустановленного назначения, инв. № 36. Ворота металлические, инв. № 6657\3. Ограждение железобетонное, инв. № 6657, 150 м. Тротуары, инв. № 1098, 50 кв. м. Многолетние зеленые насаждения, инв. № 1099\я, яблоня, 1 шт.</td><td>10 718,75</td><td>535,94</td><td>1 071,88</td></tr>
<tr><td>6</td><td>Капитальное строение общей площадью 1 966,8 кв. м, наименование – здание ТНП, назначение – здание неустановленного назначения, инв. № 36\3. Ворота металлические инв. № 6657\6. Ограждение железобетонное, инв. № 6657, 33 м</td><td>255 314,88</td><td>12 765,74</td><td>25 531,49</td></tr>
<tr><td>7</td><td>Капитальное строение общей площадью 2 875,0 кв. м, наименование – переход к ТНП, назначение – здание неустановленного назначения, инв. № 36\2. Площадка хранения металлов, инв. № 1084, площадью 500 кв. м. Автодороги площадки, инв. № 3215 дл. 60 м. Внутриплощадочный газопровод, инв. № 1115. Кабельные линии на площадке, инв. № 3219. Внешние сети ВИК на площадке ПТУ, инв. № 153</td><td>137 560,00</td><td>6 878,00</td><td>13 756,00</td></tr>
<tr><td>8</td><td>Капитальное строение общей площадью 49,1 кв. м, наименование – здание ТП, назначение – здание неустановленного назначения, инв. № 36\4. Капитальное сооружение – эстакада ж\б, инв. № 6657\Э. Ограждение железобетонное, инв. № 6657, 180м. Ворота металлические, инв. № 6657\2. Ворота металлические, инв. № 6657\4. Многолетние зеленые насаждения, инв. № 1099\я, яблоня, 3 шт. Наружные сети освещения, инв. № 1096</td><td>20 438,10</td><td>1 021,91</td><td>2 043,81</td></tr>
</table>

**Продавец: ОАО «Ритм»,** 247492, Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Светлогорское шоссе, 1.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (044) 554-10-33** Олейник Павел Станиславович – (правовая информация, предварительная запись на осмотр имущества). **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 22 октября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 22 ноября 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

